Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 343 (4249)
Панядзелак, 28 сьнежня 1931 г.
МЕНСК, Савецкая 83

Сёньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Падрыхтоўку да тарфянога сэзону разгарнуць па ўсім фронце (1 стар.). А. КАРАЧУН і А. МІТЛІН—Аб адзіай нацыянал-ухіліскай вылазцы (2 стар.).

АГЛЯД ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ—Аб нервах, асьпірыне і крызісе (2 стар).

Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі на 1932 г. (3 стар.).

Поўнасьцю і неадкладна спагнаць цьвердыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак (1 стар.).

Сурова пакараць вінаватых за шкодніцкія адносіны да коняй (1 стар).

Лепшыя паравозныя змагаюцца за пяршынства (1 стар.).

Райпартканферэнцыі выборных арганізацый правесьці пад знакам арг.-гаспад. умацаваньня калгасаў (2 стар.).

БССР будзе крайнай суцэльнай пісьменнасьці (3 стар.).

КІТАЙ—Новыя японскія дывізіі—у Манчжурыю. ПОЛЬШЧА—Катаржны прысуд на б. паслам «Змаганьня» (4 стар.)

ЧАРГОВЫ XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б

скліканецца 18 студзеня 1932 году з наступным парадкам дня:

1. Справаздача ЦК КП(б)Б: а) палітычная справаздача ЦК—т. ГЕЙ, б) арганізацыйная справаздача ЦК—тав. ШАРАНГОВІЧ.
2. Справаздача рэвізіёнкамісіі—т. КЛІМКОВІЧ.
3. Справаздача ЦКК КП(б)Б—т. КАЛНІН.
4. Аб другой пяцігодцы—т. т. ГАЛАДЗЕД, ШАПІРА.
5. Даклад ВСНГБ аб выніках работы прамысловасьці за 1931 г. і пэрспэктывах на 1932 год—тав. ГРЫСЕВІЧ.
6. Задачы культурнага будаўніцтва—т. т. ЧАРНУШЭВІЧ, ПЛАТУН.
7. Выбары.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

ПАДРЫХТОЎКУ ДА ТАРФЯНОГА СЭЗОНУ РАЗГАРНУЦЬ ПА ЎСІМ ФРОНЦЕ

Тарфяная прамысловасьць БССР—асноўнае зьвяно энэргетычна-апалавай гаспадаркі рэспублікі.

Тарфяная прамысловасьць зьяўляецца магутным фактарам індустрыялізацыі БССР, бо торф можа быць скарыстаны ня толькі як апал, але таксама як сырэц для буйной хэмічнай прамысловасьці.

Таму партыя ставіць тарфяной прамысловасьці выключна сур'ёзную ўвагу. Зламіўшы супраціўленьне шкодніцкага блёку, які накроўваў усе свае сілы на зрыў энэргетычна-апалавай гаспадаркі рэспублікі, рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам партыі, дабілася вялізарнага росту торфаздабычы.

Асабліва высокага росту дасягнула тарфяная прамысловасьць за 1931 г. Калі за апошнія 7 год да 1930 г. было здабыта ўсяго 450 тыс. тон, дык за адзін 1931 г. рэспубліканская прамысловасьць дала 376 тыс. тон торфу.

Адр ня гледзячы на гэты рост, тарфяная прамысловасьць скончыла сэзон 1931 г. з вялікім недавыкананьнем пляну. Белторфаб'яднаньне не дадало народнай гаспадарцы 342 тыс. тон торфу—47 проц. заданьня.

Такое становішча ня можа быць апраўдана ніякімі аб'ектыўнымі прычынамі.

Асноўнай прычынай недавыкананьня пляну 1931 г. зьяўляецца супраціўленьне апартуністычных элемэнтаў рэалізацыі на торфараспрацоўках 6 умоў тав. Сталіна.

На торфараспрацоўках у большасьці вымагаў набор рабочай сілы рабіўся самацёкам. Дрэнныя бытавыя ўмовы, у радзе месц нятбікасьць і непаваротлівасьць тарфяной кампаніі, махрова — «лявацкая» ўраўніловка ў зарплаце парадкала цякучасьці рабсілы. На такіх буйных і рашаючых распрацоўках, як Асінторф, у разгары сэзону прыбывала ў месяц 800 рабочых і выбывала 600-700.

Праца на торфараспрацоўках ня была арганізавана па-новаму. Асноўны механізм на распрацоўках—фарміравочная машына—па большасьці заходаў была абязьлічана. У выніку механізм скарыстаны толькі на 30-40 проц.

Торфаб'яднаньне не вяло рашучай барацьбы за стварэньне новых тэхнічных катраў. На буйнейшых распрацоўках (Асінторф, «Шлях сацыялізму»), дзе працуе каля 3-4 тыс. рабочых, ёсьць усяго 2-3 тарфмэйстры. Але і наяўны тэхнічны пэрсанал у значнай сваёй частцы скарыстоўваўся для канцылярскай работы, а не для баявога кашкротна-апэрацыйнага тэхнічнага кіраўніцтва і арганізацыі працы на распрацоўцы.

Гаспадарчы разрахунак не ўкаранён. Плянавае заданьне не даводзіцца да брыгады і тым самым паслабляецца разгортваньне сацыялістычных мэтадаў працы.

Белторфаб'яднаньне і ВСНГ не кіравалі па-новаму тарфяной прамысловасьцю. Абязьлічка ў цэнтральным апараце аб'яднаньня, апартуністычны самацёк замянялі цьвёрдае бальшавіцкае гаспадарча-тэхнічнае кіраўніцтва заводамі.

Адказнасьць за дрэнную работу торфзаводаў нясуць таксама партыйныя камітэты па месцы знаходжаньня заводаў, і ў першую чаргу парткомы Воршы, Смалявіч, Гомеля, якія вельмі позна ўзяліся за кіраўніцтва заводамі.

Толькі гэтымі прычынамі тлумачыцца недадача краіне 324 тыс. тон торфу, толькі разгільдзяйствам і недаацэнкай гэтай рашаючай галіны прамысловасьці можа быць вытлумачана тое, што якасьць торфу нізкая, што яго вільготнасьць дасягае 40-50 проц., што сабекошт яго перавышае плянавае заданьне на 25 проц.

Становішча пагаршаецца яшчэ і тым, што амаль увесь здабыты торф застаўся на палёх. На 10 сьнежня вывезена толькі 45 тыс. тон торфу. Адсутнасьць вывазкі тлумачыцца тымі-жа прычынамі—няўменьнем прыцягнуць калгасны абоз да вывазкі.

Гэтыя вынікі работы тарфяной прамысловасьці за 1931 г. прывялі да поўных перабояў у забесьпячэньні торфам Белдрэсу, добрускай папяровай фабрыкі і інш. прадпрыемстваў.

Паўтыя далей такога становішча цярпець ня можа.

Рэспубліканская тарфяная прамысловасьць, якая павінна ў 1932 г. даць больш, чым у тры разы торфу, здабытага ў 1931 г., павінна быць цалкам забясьпечана бальшавіцкім гаспадарча-тэхнічным кіраўніцтвам. Урокі 1931 г. павінны быць улічаны.

Неабходна зараз-жа прыступіць да заключэньня дагавораў з калгасамі на рабочую сілу і возчыкаў. Неабходна шырока растлумачыць калгасьнікам і бядняцка-серадняцкім масам значэньне торфу для народнай гаспадаркі. Канчаткова зьнішчыць «лявацкую».

Зараз-жа фарсаваць тэмпы падрыхтоўкі балот да сэзону, прывесьці ў парадак баракі, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну жыльлёвага будаўніцтва. Прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі абавязаны пераглядзець тарыфы аплаты тарфянікаў, канчаткова зьнішчыць «лявацкую ўраўніловку».

Трэба прывесьці мэханізмы ў баявы парадак. Падрыхтаваць мэханічныя майстэрні на торфараспрацоўках сэзону, ліквідаваць абязьлічку ў рамонце тарфяной машыны. Тарфяная прамысловасьць павінна атрымаць дэтальна распрацаваны плян далейшай мэханізацыі торфаздабычы і вывазкі. Дрэнна за выкананьне гэтага пляну—баявая задача партыйных гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый торфапрамысловасьці.

Неабходна забясьпечыць укараненьне гаспадарчага разрахунку ў самае нізавое вытворчае зьвяно торфзаводаў—у брыгаду.

Асаблівай увагі заслугоўвае падрыхтоўка да здабычы фрэзэрнага торфу—найбольш эфэктыўнага і таннага віду торфу, барацьба з кансэрватызмам у яго здабычы і скарыстаньні.

Партыйная і прафэсыянальная работа на торфараспрацоўках патрабуе карэннай перабудовы і паляпшэньня.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі павінны стаць на чале барацьбы за бальшавіцкую арганізацыю працы на торфараспрацоўках, за баявое выкананьне 6 умоў тав. Сталіна, за перавыкананьне калгасьніка, прыпоўнага на торфараспрацоўкі, у сэфэдэмка пралетара-ўдарніка тарфяной прамысловасьці.

Барацьба за прамфінплян тарфяной прамысловасьці 1932 г., за добраякасны, сухі і танны торф, за своячасовую вывазку торфу да заводаў, электрастанцый—зьяўляецца баявой задачай усёй КП(б)Б. Гэта задача зможа быць выкананая толькі ў бязьлітасным змаганьні з правымі і «левымі» апартуністамі, з канкрэтнымі посьбітамі разгільдзяйства, самацёку і чыноўніцкага благадушшя ў выкананьні адной з асноўных задач індустрыялізацыі — стварэньня магутнай энэргетычна-апалавай базы.

Усесаюзны конкурс спараных.

ЛЕПШЫЯ ПАРАВОЗНЫЯ ЗМАГАЮЦЦА ЗА ПЯРШЫНСТВА

Камсамольская ўперадзе

Паравоз серыі Щ-561 дастаўся камсамольскай ударнай брыгадзе Менскага чыгуначнага дэпо Досіну і Курыловічу з вялікім дэфэктамі. Была паламана ростэрная труба, залатнік левага шыбора і інш.

На працягу трох дзён ня толькі рукамі майстроў спэцыялістаў, але і рукамі Досіна, Курыловіча і іх памочнікаў былі залечаны раны, нанесеныя паравозу абязьлічкай.

Ні адзін машыніст, апрача Досіна і Курыловіча, не саджаўся на паравоз. За два гады работы на паравозе яны дакладна вывучылі яго. Ня было такога выпадку, калі-б тая ці іншая дэталь псавалася і выходзіла са строю па недагляджэ машыністаў.

Весь чаму паравоз Щ-561 дабіўся добрых паказальнікаў. За кастрычнік і лістапад мясцы норма прабегу выкананa на 117 проц. Ні хвіліны ня спыняўся паравоз у дарозе. За два мінулыя месяцы брыгада зрабіла нагону на 118 мінут. Эканомія апалу складае 13 проц.

З пачатку сьнежня брыгада ўключылася ва ўсебеларускі конкурс. За гэты час з'эканомлена 595 клгр. вугалю, 13 клгр. газы і 15 клгр. абціраючых матар'ялаў. У чым сакрэт дасягнутай эканоміі апалу?

Трэба ведаць, як трымаць паравоз і топку, адказваюць самі машыністы. Трэба ўлічыць, па якім зубу ставіць рэверс і рэгулятар, а галоўнае дабіцца правільнай якаснай сумесі вугалю.

— У жніўні паравоз наш меў—кажуць яны, — перашая вугалю толькі таму, што мы ня ведалі, якім чынам зрабіць правільную якасную сумесь і яна мелі выстарчальнага вопыту, якім чынам устанавіць рэжым топкі. Зараз мы гэта ведаем і таму эканомім апал

Першыя перамогі

Рад ударных брыгад Віцебскага вузла, якія прымаюць удзел у усесаюзным конкурсе, на першым этапе ужо атрымалі відаочныя перамогі.

Брыгада паравозу С-18 (машыністы Рэут і Нікапаеў) з'эканомілі за палову сьнежня 15.553 клгр. апалу. Ні аднаго зрыву спаранай ня было. Брыгада мае 5 гадз. 52 хвіл. нагону. За своячасовае складаньне на раскладзе і ўзорнае трыманьне паравозу ў чыстаце, брыгада атрымала ад адміністрацыі дэпо 18 сачаў.

Паравоз машыністаў **Сіменчыка і Івашкевіча** (С-17-1) пры даной норме месячнага прабегу ў 6.900 клм., за палову сьнежня зрабіў 3.562 клм. Брыгада з'эканоміла 7.138 клгр. апалу. Мае нагон спазьненьняў 1 гадз. 49 хвіл.

Побач з гэтымі перадавымі брыгадамі, рад іншых, якія прымаюць удзел ва ўсесаюзным конкурсе, яшчэ не дабіліся значнага паляпшэньня сваёй работы.

Спаранная брыгада **Міронава і Агнева** паравозу Э-17 пры даной месячнай норме ў 4.500 клгр., за 15 дзён сьнежня зрабіла 2.077 клм. Брыгада дапусьціла два зрывы спаранай, дзьве астаноўкі ў дарозе (у 68 хвіл.) з-за недахвату пары. Эканомія апалу складае 4.019 клгр.

Брыгада машыніста **Мурашова і Шчвінава** мае ў першай палове сьнежня два зрывы спаранай. Пры норме месячнага прабегу ў 4.200 клм., выкананa—2.075. Эканомія апалу—13.479 клгр. і нагон—3 гадз. 54 хвіл.

Брыгада **Зайцава і Шчарбакова** ня выканала нормы прабегу (месячная норма—4.500 клм., а з 1-га да 10-га сьнежня выканана — 2.085) Брыгада Зайцава дапусьціла 5 зрываў спаранай. Апалу з'эканомлена 3.264 клгр., нагон складае 5 гадз. 18 хвіл.

Як відаць, асноўным недахопам у рабоце спаранай брыгад зьяўляецца зрыў спаранай і невыкананьне прабегу. Неабходна на гэтых пытаньнях скаўцэнтраваць увагу ўсіх паравозных брыгад вузла.

Адміністрацыя дэпо павінна навесьці барацьбу з выпадкамі перастою паравозаў з-за несваячасовага рамонту.

Брыгада друку:
СІНЕЛЬНІКАЎ і МАКСІМАЎ.

Арганізавалі ўнутрыдэпоўскі конкурс

У сувязі з правядзеньнем усесаюзнага і ўсебеларускага конкурсу лепшых спараных брыгад, перадавыя паравозьнікі Менскага дэпо ўнесьлі прапанову арганізаваць унутрыдэпоўскі конкурс на лепшую спараную брыгаду.

Партыйныя, прафэсыянальныя, гаспадарчыя арганізацыі з гэтай прапановай згадзіліся і сумесна з радкалегіяй шмат тыражкі «Чырвоны чыгуначнік» абвясьцілі двухмесячны унутрыдэпоўскі конкурс.

Для кіраўніцтва конкурсам вылучана журы.

Лепшым спараным брыгадам, якія дабіваюцца першынства па выкананьні ўсіх заданых вымаральнікаў, будуць выданы прэміі.

Ініцыятыву Менскіх паравозьнікаў трэба падтрымаць.

Н. Г.

Уключыліся ў спаборніцтва

Спаранная брыгада паравозу Щ-373 у складзе таварышоў **Жаўнэрчыка, Цельні, Галабурды, Вардомскага, Шахрая і Шышкіна** абвясьцілі свой паравоз ударным і ўключыліся ва Ўсебеларускі конкурс.

Гэтая брыгады бязумоўна заслужылі права ўдзельнічаць у конкурсе. Па выкананьні асноўных вымаральнікаў, яны дабіліся значных посьпехаў. З лютага 1931 году і па сёньняшні дзень іх паравоз ня меў ніводнага выпадку зрыву спаранай. Нагону ў пуці дасягнута 7 гадзін 55 хвілін. Спазьненьняў ў пуці і выпадкаў псаваньня паравозу ня было. За эканомію апалу брыгады штомесячна атрымліваюць прэмію.

На працягу ўсяго часу брыгады прымаюць актыўны ўдзел у прамывачным рамонце, а дробны рамонт робяць уласнымі сіламі.

Г.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

Поўнасьцю і неадкладна спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак

Разгортваючы масава-растлумачальную работу, змагаючыся з правымі і „левымі" скажэньнямі лініі партыі дабіцца 100 проц. выкананьня пляну збожжазагатовак па індывідуальным сэктары

26-га сьнежня

Паводле даных Наркамснабу на 25-га сьнежня гадавы плян збожжазагатовак па рэспубліцы выкананы на 75 проц. Пятая пяцідзёўка сьнежня не дала патрэбнага зруху ў ходзе кампаніі. Прырост за 5 дзён складае толькі 2,8 проц. гадавога пляну.

Аднаасобны сэктар — самы адсталы вучастак збожжазагатовак. Пры выкананьні агульна-рэспубліканскага гадавога пляну па 75 проц., па індывідуальным сэктары заданьне рэалізавана толькі на 66,6 проц. Гэта тлумачыцца апартуністычнай недаацэнкай ролі аднаасобніка ў збожжазагатоўках, якая мае месца ў асобных раёнах і радзе сельсаветаў (Аршаншчына, Шклоўшчына і інш.).

Масавая работа сярод бедняко ў і сераднякоў—аднаасобнікаў пастаўлена ў гэтых раёнах незадавальняюча, а ў радзе сельсаветаў зусім ігнаруецца. Загатоўчыя арганізацыі разу раёнаў не пастанілі работы так, каб забясьпечыць своячасовае паступленьне збожжа па кантрактацыі і самаабавязацельствах. Даволі паказаць, што плян загатовак збожжа ад аднаасобнікаў па кантрактацыі выкананы толькі на 25,5 проц.

І зусім недапушчальна праходзіць спагнаньне цьвёрдых заданьняў па кулацка-заможных гаспадарках. У сярэднім па рэспубліцы цьвёрдыя заданьні спагнаны толькі на 35,7%. Па некаторых раёнах цьвёрдыя заданьні не спагнаны нават і на 25%. (Чырвона-Слабодзкі — 14,4%, Чавускі — 11,4 проц., Хойніцкі — 11,8 проц., Прапойскі — 14 проц., Бялыніцкі—13,7 проц., Буда-Кашалёўскі — 10 проц., Аршанскі — 8,5 проц., Лоеўскі — 23 проц. і г. д.).

Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе. Ясна, што ў даных раёнах з боку паасобных арганізацый праяўлена махровая апартуністычная практыка і элемэнты патураньня кулаку.

У асобных раёнах пры давядзеньні цьвёрдых заданьняў дапушчаны грубейшыя «лявацкія» скажэньні палітыкі партыі. У **Гарадоцкім** раёне, напрыклад, цьвёрдыя заданьні склала ноць непамерна вялікі процант, тое-ж самае ў Каралінскім, Лёзьнянскім, Петрыкаўскім раёнах.

Неабходна моцна ўдарыць па правых апартуністах і «левых» і забясьпечыць поўнае неадкладнае выкананьне цьвёрдых заданьняў. Трэба раўняц па па **Сураскім, Расонскім, Дрысенскім і Сенненскім** раёнах, дзе на аснове правільнага правядзеньня палітыкі партыі, цьвёрдыя заданьні спагнаны поўнасьцю.

Мацней націск на кулацка-заможныя гаспадаркі!

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

На 20 сьнежня **Полацкі** раён выканаў гадавы плян збожжазагатовак па 81.1 проц. Між тым, раён меў усе магчымасьці да гэтага часу ня толькі поўнасьцю выкананць, але і перавыкананць заданьне. Гэта з усёй яснасьцю даказана перавыкананьнем сельсаветамі, якія, па-бальшавіцку ацаніўшы значэньне збожжазагатовак, дабіліся значных посьпехаў на гэтым фронце. **Зкіманскі** сельсавет, напрыклад, выканаў гадавое заданьне на 103,6 проц., **Семяніцкі** — на 100 проц.

Тое, што раён у цэлым адстаў у збожжазагатоўках, тлумачыцца марудным ходам кампаніі па **Заскарскім, Бабынецкім, Дамнікоўскім, Тураўлянскім, Юравіцкім і Кулікоўскім** сельсаветах, дзе гадавыя заданьні рэалізаваны ня больш, чым на 50-55 проц.

У **Юравіцкім** сельсавеце няма рашучага націску на кулака. Цьвёрдыя заданьні ня выконваюцца. Сельсавет замест таго, каб прыцягнуць да суровай адказнасьці кулацка-заможныя элемэнты, якія сабатуюць здачу збожжа дзяржаве, сам фактычна дапамагае ім ігнараваць выкананьне цьвёрдых заданьняў. Няўдача сельсавет разаслаў усім цьвёрда-заданьнікам такога роду паперкі: «Выконвайце цьвёрдыя заданьні пакуль што на 50 проц., а там пабачым». Карыстаючыся гэтым, кулакі чакаюць пакуль сельсавет іх вызваліць ад здачы збожжа і цьвёрдых заданьняў зусім не выконвалі. Сельпартком таксама не вядзе рашучай барацьбы з кулацкім сабатажам збожжазагатовак.

Наогул, з выкананьнем цьвёрдых заданьняў па ўсім раёне, справа стаіць зусім незадавальняюча. Усе тэрміны даўно прайшлі, а па раёну цьвёрдыя заданьні спагнаны толькі на 36 проц.

Неабходна рашуча ўзмацніць націск на кулацка-заможныя элемэнты, дабіцца ва што-б там ні стала поўнага і неадкладнага выкананьня цьвёрдых заданьняў. Гэта — задача ўсёй партарганізацыі, усёй пралетарскай грамадзкасьці Полаччыны.

Анат. Ш.

СУРОВА ПАКАРАЦЬ ВІНАВАТЫХ ЗА ШКОДНІЦКІЯ АДНОСІНЫ ДА КОНЯЙ

У ВЫНІКУ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ ТАЛАЧЫНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НЕЗАКОННА ЗАБІТА 1000 ШТУК КОНЯЙ І МАЛАДНЯКА

Змагацца за захаваньне і павялічэньне конскага парку

У выніку кулацкага шкодніцтва, зімой 1930 году, частка коняй была зьнішчана і некаторыя калгасы мінулую веснавую пасяўную кампанію праводзілі ў надзвычай напружаным становішчы. Нагрузка на аднага каня ў некаторых месцах даходзіла да 8-9 гэкт. і больш. Усё гэта вяло да расцяваньня тэмпаў сяўбы і, як вынік, паніжэньня ўраджайнасьці.

Увесь перыяд пасеўнай суправаджаўся крыкамі аб недахопе цягавай сілы. Здавалася-б, што ўсе раённыя арганізацыі павінны былі зрабіць з гэтага адпаведныя вывады. Павінны былі-б павесьці адпаведную работу за захаваньне і павялічэньне конскага парку і падрыхтоўку яго да нашых хозяйчай вясны.

Мы падаўна друкавалі матар'ялы з Крупскага, Уваравіцкага раёнаў, дзе ня ўлічылі ўрокаў мінулага, праявілі недаацэнку конскай цягі, не мабілізавалі ўвагі калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў вакол пытаньняў правядзеньня нармальнай зімоўкі і падрыхтоўкі коняй да вясны. Усё гэта дало магчымасьць кулацкім элемэнтам з наступленьнем зімы аднавіць сваю шкодніцкую работу па зьнішчэньні коняй. Факты незакожнага ўбою коняй з кожным днём павялічваюцца.

Асабліва трывожным сыгналам зьяўляецца матар'ял нашага карэспандэнта з Талачынскага раёну, дзе, поўнай бязьдзейнасьці раённых арганізацый кулацкія элемэнты пад выглядам выбракоўкі пачалі масавае зьнішчэньне працаздольных коняй.

За апошні час па раёне незаконна забіта звыш 1000 коняй і маладняка. У некаторых калгасах кулацкія агенты перайшлі да адкрытага шкодніцтва. У калгасе вёскі Глінка пачалі марыць коняй голадам. Асабліва недапушчальным зьяўляецца той факт, што пры дапамозе некаторых сельспажыўтаварыстваў пад нож трапляе маладняк. Так, Коханаўскае таварыства накіравала на забой партыю коняй, сярод якіх аказалася зусім прыгодных 9 штук маладняка і 60 коняй.

Усе гэтыя факты гавораць, што клясавы вораг праяўляе актыўнасьць на адным з важнейшых вучасткаў пад рыхтоўкі да вясны. Ён імкнецца расстроіць конскі парк і тым самым застрамаіць пасьпяховае правядзеньне пасеўнай.

Гэтым вылазкам клясавага ворага і яго агентам-апартуністычным элемэнтам—трэба супроцьпаставіць шырокую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-сераднякоў аб захаваньне ўсяго конскага парку. Бездакладна дабіцца ліквідацыі абязьлічкі на стайнях—прыцягваючы да суровай адказнасьці за ўсе выпадкі няўважлівых адносін да коняй, аддаючы пад суд вінаватых у незаконным забоі.

Кулацкія агенты за работай

ТАЛАЧЫН. (Наш кар.). Пасеўная плошча ў 1931 годзе па раёне складала 78.000 га. У 1932 годзе разам з зааранай цаліной запраектавана павялічэньне да 99.000 га, або рост на 20 проц.

Калі дадаць, што плян заблітва ўвосень выкананы на 33 проц. і тое, што сяўбу патрэбна правесьці ў максымальна кароткі тэрмін (15-20 дзён), дык зусім відавочна значэньне конскай цягавай сілы.

Але калгасна-зямельныя арганізацыі і некаторыя сельсаветы Талачынскага раёну недаацэньваюць гаспадарча-палітычнай важнасьці конскай цягавай сілы. Масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў—бядняко ў і сераднякоў не мабілізаваны вакол выкананьня дырэктыў, ураду аб паляпшэньні догляду і ліквідацыі драпежніцкіх адносін да коняй. Зусім не вядзецца барацьба з незаконным забоем коняй.

У выніку конскі парк разбазарваецца. Значная частка гіне ад рук клясава-варожых і чужых нам людзей.

[illegible] прыбіванага падпіку раённага ветработніка тав. Чарнікова за апошні час незаконна забіта каля 1.000 коняй. За 20 дзён сьнежня месячны плян заготовак буйнога скурсырцу выкананa на 175 проц. у той час, як плян заготовак па дробным скурсырцы выкананa на 33 проц. Такім чынам перавыкананьне пляну заготовак па буйным скурсырцы ідзе за лік конскіх скур.

Рад спажыўтаварыстваў і ў прыватнасьці коханаўскае табукамі наладзіўваюць коняй на забой у Воршу. У апошняй партыі з 300 штук аказалася прыгодных для працы 60 штук коняй, 9 штук маладняка.

Так, праўлеўнае калгасу «Зарэва» (Лясьнянскі сельсавет) забракавала 8 коняй, годных для працы. Сярод іх выбракавана кабыла толькі, таму што ёй патрэбна шмат корму і яна нярыхтожай масьці. Калгас імя «XIV зьезду КП(б)Б» забракаваў 12 працаздольных коняй.

Адсутнасьць масава-растлумачальнай работы і зусім невыстарчальная дзейнасьць раённай міліцыі і судовых устаноў у прыцягненьні да адказнасьці вінаватых за незаконны забой коняй даюць магчымасьць у радзе масцраёну кулаку праводзіць шкодніцкую работу.

Характэрны для паказаньня няўмнасьці недаацэнкі конскай цягавай сілы і з боку раённых арганізацый наступны факт. На пленуме РВК, які адбыўся 19 сьнежня, пасьля выступленьня старшыні сельсавету па ліквідацыі падрыхтоўкі да пасеўнай 1932 году старшыня РВК тав. Лявоненка заявіў, што пытаньні падрыхтоўкі конскай цягавай сілы да вясны не ўваходзяць у падрыхтоўчую работу.

Барысэвіч.

Аб забароне забою коняй і пра адказнасьць за драпежніцкую эксплёатацыю іх

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Ня гледзячы на вялізарнае значэньне, якое мае конская цягавая сіла ў народнай гаспадарцы, да апошняга часу наглядаецца яўная недаацэнка ролі і значэньня коня для сельскай гаспадаркі, транспарту і арміі. Савецкія установы і гаспадарчыя арганізацыі не вядуць амаль ніякай растлумачальнай работы сярод рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняка-сераднякага насельніцтва, выхаваньне і належнае ўтрыманьне коняй. [illegible] выпадкі драпежніцкай эксплёатацыі коняй, дрэннага ўтрыманьня і абыходжаньня з коньмі, пакіданьне і без догляду і інш.

Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР у далатак па свае пастановы за 25-га сьнежня 1930 г. «Пра забарону забою коняй» (З. З. 1931 г. адд. 1, № 1, паст. 4) і на аснове пастановы ЦВК і СНК СССР за 7 сьнежня 1931 г. «Пра забарону забою коняй і пра адказнасьць за незаконны забой і драпежніцкую эксплёатацыю коняй» («Изв. ЦИК СССР и ВЦИК» за 11 сьнежня 1931 г. № 340) пастанаўляюць:

1. Прыцягваць да адказнасьці ня толькі за незаконны забой коняй, але і за наўмыснае пакалечаньне коняй і значыльна-сядбайнае абыходжаньне з імі. Вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы нясуць адказнасьць у паралку і разьмерах, прадугледжаным пастановаю ЦВК і СНК СССР за 7 сьнежня 1931 г.

2. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы шырока апавясьціць насельніцтва аб пастанове ЦВК і СНК СССР за 7-га сьнежня 1931 г. і аб гэтай пастанове і ў 3-хдзённы тэрмін перагледзець свае ранейшыя абавязковыя пастановы аб забароне забою коняй у адпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК СССР за 7-га сьнежня 1931 г.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту юстыцыі на працягу 5 дзён падаць у Савет Народных Камісараў праект адпаведных зьмен Крымінальнага Кодэксу, якія вынікаюць з гэтай пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР—Г. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР—Н. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ГНІЛЯКЕВІЧ.



Гомельскі Шклобуд

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

РАЁННЫЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ ВЯСКОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

правесьці пад знакам павышэньня работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў

ЗА ЯКАСЬЦЬ РАБОТЫ

Справаздачна-перавыбарчая кампанія парторганаў уступіла ў пэрыяд правядзеньня раённых партканфэрэнцый. Важнейшая задача партканфэрэнцый — падагуліць работу раённых партарганізацый па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па-бальшавіцку мабілізавацца на няўхільнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, што зьяўляецца зараз цэнтральнай задачай усяго калгаснага руху.

Сацыялістычны сэктар у вёсцы зьяўляецца асноўным вытворцам с.-г. прадукцыі. У параўнаньні з мінулым годам сёлета ва многіх калгасах значна павышана вытворчасьць, павялічыўся даход калгасьнікаў.

Бліскучыя паказальнікі гаспадарчай эфэктыўнасьці калгасаў набыты галоўным чынам там, дзе правільна арганізавана праца, дзе масцовыя партарганізацыі паставілі ў цэнтр сваёй увагі задачу барацьбы за якасьць работы, за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за высокую таварнасьць калектыўнай гаспадаркі. Гэтыя вытворчыя посьпехі калгасаў забясьпечваюцца няўхільным ажыцьцяўленьнем дырэктыў партыі аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, шырокім разгортваньнем масавай работы, бязьлітаснай барацьбой супроць кулака і ўсякіх праяўленьняў апартунізму і прымірэнцтва да яго.

Укараненьне ва ўсе галіны работы зьдзельнічыны, налажаньне дакладнага ўліку працы, ліквідацыя абязьлічкі, аўладаньне тэхнікай калгаснай вытворчасьці, цьвёрдае правядзеньне крыцыкаў у разьмеркаваньні ўраджаю «хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае»—актуальнейшыя практычныя пытаньні, ад вырашэньня якіх залежыць гаспадарчае ўмацаваньне кожнага калгасу.

Між тым арганізацыя зьдзельнай работы, як адно з важнейшых мерапрыемстваў у сыстэме барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, ва многіх месцах ажыцьцяўляецца яшчэ вельмі слаба. Паводле вестак Калгасцэнтру на зьдзельнічыну пераведзена толькі 86,7 проц. калгасаў, а калі ўлічыць, што яшчэ ў разе калгасаў зьдзельнічына існуе толькі намінальна, а на справе захоўваецца сапраўдная падзёнка, плюс наяўнасьць шматлікіх фактаў абязьлічкі ў рабоце і ўраўнялаўкі пры разьмеркаваньні ўраджаю—становішча відавочным вельмі невыстарчальная яшчэ работа пекаторых партячэек і паасобных раённых партарганізацый у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Слабую работу вясковых партарганізацый па кіраўніцтве калгасным будаўніцтвам імкнуцца выкарыстаць і выкарыстоўваюць кулацкія элементы для развалу калгасаў з сярэдзіны. Правыя апартуністы, простыя дапаможнікі кулаку, сабатуючы дырэктывы партыі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, часамі пад выгам барацьбы з абязьлічкай дамагаюцца раздачы аграмаджанай маемасьці калгасьнікам, чым па сутнасьці ставяць той ці іншы калгас пад пагрозу развалу. Апартуністы з «лявацкага» лягеру, ігнаруючы задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, пагоняй за дутымі лічбамі калектывізацыі, дзейнічаюць на руку клясавому ворагу і кулаку ў яго супраціўленьні разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню.

Усё гэта патрабуе ад райпарткамфэрэнцый, якія зараз праходзяць, мабілізацыі партарганізацый на бязьлітасную барацьбу на два фронты і самага рашучага змаганьня з праяўленьнямі гнілога лібэралізму да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі.

Надзвычай важнай задачай у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца неабходнасьць стварэньня пастаянных брыгад, складзеных на вытворчым прынцыпе, і паступовага пераводу ўсіх галін работы ў калгасах на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельнічыну. Зразумела, што нельга гаварыць аб посьпехах зьдзельнічыны пры наяўнасьці абязьлічкі і адсутнасьці дакладнага ўліку працы ў калгасах. У аснову ўсёй работы на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў трэба палажыць рэалізацыю 6 умоў т. Сталіна, якія забясьпечваюць перамогу.

Паказальнікі ўзорнай работы

Справаздачна - перавыбарчая кампанія бюро ячэек КП(б)Б зьявілася магутным фактарам, мабілізуючым масы на выкананьне чарговых задач партыі ў вёсцы.

Латыгольская парт'ячэйка (Сененьскі раён) асноўную ўвагу сканцэнтравала на зачках арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і правядзеньня гаспадарча - палітычных кампаній. Разгортваньнем шырокай масавай работы парт'ячэйка забясьпечыла значныя посьпехі. Калі да часу перавыбарчай кампаніі парт'арганізацыя Латыгольскі сельсавет зьяўляўся найбольш адсталым у раёне па выкананьні плянаў загатовак і мабілізацыі сродкаў, дык зараз ён стаў у рады перадавых.

Плян мабілізацыі сродкаў выкананы на 100,2 проц. Збожжазагатоўчыя пляны таксама поўнасьцю выкананы.

Найбольш узорныя прыклады работы паказвае калгас «Латыголь». Малочна - таварная ферма калгасу ўкамплектавана стадам на 120 проц. Заданьне па здачы (продажы) дзяржаве малака перавыканана. Калгасам здана 120 цэнт. збожжа, што складае 100 проц. плянавага заданьня.

Дзякуючы правільнай арганізацыі працы ў калгасах, увядзеньню зьдзельнічыны, ліквідацыі абязьлічкі і рашучай барацьбе з кулацкімі тэндэнцыямі, калгас «Латыголь» зьяўляецца найбольш моцным і паказальным у гаспадарчых адносінах сярод наўколышніх калгасаў. Гэтымі днямі тры хробыя калгасы далучыліся да Латыгольскага. Парт'ячэйка калгасу расставіла свае сілы з такім разьлікам, каб забясьпечыць узмацненьне свайго ўплыву на асноўных вучастках работы ўзбуйненага калгасу.

Б. ЗЭЛЬЦЭР.

Правільная арганізацыя працы вырашае вытворчыя посьпехі

Становішча калгасу імя **Дембаля** (Барысаўскі раён) паказвае, як партыйная ячэйка гэтага калгасу сапраўды па-бальшавіцку змагалася за выкананьне пастаўленых перад ёю гаспадарча-палітычных задач.

Плян веснавой сяўбы калгасам выкананы на 122 проц. За пасьпяховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі калгас атрымаў пераходны сьцяг. Уборачная кампанія праведзена ўдарным парадкам і закончана на 15 дзён раней устаноўленага тэрміну.

Парт'ячэйка калгасу апэрацыйна і канкрэтна кіравала ходам уборкі і зяблівы. У часе капаньня бульбы на паасобных вучастках мела месца адставаньне. Парт'ячэйка, вывучыўшы прычыны гэтага адставаньня, паставіла пытаньне на сходзе калгаснікаў. Перадавыя брыгады па капаньні бульбы ўзялі на грамадзкі буксір адстаючых і гэтым самым была забясьпечана свячасовая ўборка бульбы на ўсіх вучастках.

Асепьняя бульба і зяблева таксама праведзены свячасова, прычым пляны зяблева перавыкананы.

Калгас мае СТФ, у якой налічваецца 101 сьвіпаматка і 71 кнур. У МТФ ёсьць 107 штук прадукцыйнай жывёлы. Удвядзеньне зьдзельнічыны ў МТФ павысіла на 9 проц. удой.

Калгас падзелен на 12 паасобных вучасткаў. Свае сілы парт'ячэйка расставіла галоўным чынам на вядучых вучастках гаспадаркі (СТФ, МТФ). У мэтах ліквідацыі абязьлічкі на пэўных відах работ прымацаваны брыгады, створаныя па вытворчым прынцыпе. Цягавая сіла і сельска-гаспадарчы інвэнтар знаходзяцца ў поўным парадку. У калгасе вядзецца рашучая барацьба за зьвяшчэньне ўраўнілаўкі. Розныя віды работы разьмеркаваны па катэгорыях з такім разьлікам, каб больш цяжкая і кваліфікаваная праца лепш аплачвалася. Паміж усімі брыгадамі заключаны дагаворы па сацспаборніцтве. Выкананьне пунктаў дагавораў сыстэматычна правяраецца.

Пасьля апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў парт'ячэйка гэту задачу паставіла цэнтральнай на ўсёй сваёй рабоце. Правільнай арганізацыяй працы ў калгасе, бязьлітаснай барацьбой з праяўленьнямі кулацкіх тэндэнцый, барацьбой з апартуністычнай практыкай парт'ячэйка забясьпечыла вялізарныя вытворчыя посьпехі. **Прыбытак калгасьнікаў у параўнаньні з мінулым годам павялічыўся на 21 проц. Калгас** з посьпехам выканаў свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай. Пляны загатовак збожжавых культур і бульбы выкананы на 100 проц. Заданьне па здачы (продажы) мяса і малака перавыкананa.

Па-бальшавіцку змагаючыся за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу, парт'ячэйка забясьпечыла пярэмства калгасу імя Дембаля ў раёне па выкананьні гаспадарча-палітычных задач.

Брыгада «Правды» і «Зьвязды»: **Нэйдзін і Зуевіч**

АБ НЭРВАХ, АСЬПІРЫНЕ І КРЫЗІСЕ

Прапаведзь «польскага заціпіна» **не дапамагла.** Усе патугі фашысцкіх і сацыял-фашысцкіх пісак замоўчаць эканамічны крызіс скончыліся поўным крахам.

У спэцыфічных умовах Польшчы эканамічны крызіс набывае **асабліва вострыя формы.** Ён цесна пераплятаецца з усё ўзрастаючым **аграрным** крызісам.

Праз штучна аптымістычны тон польскага буржуазнага друку ўсіх напрамкаў і адценьняў штораз часьцей прарываюцца ноткі найглыбейшага пэсымізму і роспачы. Газэтных лёкаяў капіталізму ахапіла паніка. Крызіс прымушае аб сабе гаварыць. За апошні час польскі буржуазны, фашысцкі і сацыял-фашысцкі друк асабліва турбуе **катастрафічнае паглыбленьне аграрнага крызісу.** Яго рэакція праяўленьні, яго бязупыннае нарастаньне не на жарт палохае дыктатуру фашызму. Нават з твару афіцыёзнай урадавай прэсы зьнікае пячатка ружовага- «благодушя». Пад ударамі крызісу трашчыць па ўсіх швох тэорыйка «польскага заціпіна». Шыла ў мяшку не схаваеш.

10 сьнежня афіцыёзны **«КУР'ЕР ВІЛЕНСКІ»** ў сваёй перадавой в бязьмежным пэсымізмам заяўляе:

«Ёсьць толькі адно акрэсьленьне для цяперашняй сітуацыі вёскі — ВЕСКА ДУШЫЦЦА...»

Ва ўнісон «Кур'еру Віленскаму» орган памешчыкаў **«СЛОВО»** вымушан прызнаць, што:

«...тры гады назад мы характарызавалі сітуацыю ў віленскім зямляробстве, як РАСПАЧЛІВУЮ. Як назваць яе сёньня? Сітуацыя БЕЗНАДЗЕЙНАЯ — гэтага яшчэ мала» («Слово» ад 12 сьнежня).

Свае прызнаньні «Слово» мімаходам дапаўняе кароткай, але вельмі яркай і характэрнай ілюстрацыяй:

«Дробны зямляроб, каб аплаціць падатні, страхоўку і даўгі, павінен пазбавіцца ад усяго інвэнтару...»

Лёгка ўявіць сабе нават на падставе гэтых цытат тое жучаснае становішча, у якім знаходзіцца оёньня польская вёска. Каб аплаціць падаткі, селянін прымушан прадаваць усю сваю маемасьць. Перад працоўным селянінам паўстала грозная здань галоднай сьмерці. Гэта — вынік фашысцкай дыктатуры. Сьцяўшы зубы, «Кур'ер Віленскі» канстатуе бязвыходнасьць становішча асноўных сялянскіх мас:

«Перад вайной, калі мы ня ведалі амаль зусім беспрацоўя, безьзямельныя і малазямельныя ішлі ў горад і там зараблялі кавалак хлеба. Цяпер у гэтых адносінах сітуацыя радыкальна зьмянілася. Селянін ведае, што заработку ў горадзе ня знойдзеш...» («К. В.», 10 сьнежня).

Крызіс з усёй сілай агаляе супярэчнасьці капіталізму, якія штораз паглыбляюцца. Ножніцы паміж цэнамі прамысловых і с.-г. прадуктаў расширяюцца да нячуваных разьмераў. Эканамічна зруйнаваная вёска ўсё больш і больш скарачае сваю пакупную здольнасьць. Треба прыняць пад увагу, што ў Польшчы на вёску падае 75 проц. агульнай колькасьці насельніцтва. Унутраны рынак збыту бязупынна зьмяншаецца.

Цэнтральны орган урэду—**«ГАЗЭТА ПОЛЬСКА»** ня ў сілах замоўчаць катастрафічнае становішча таварнага рынку:

«... таварны рынак у даны момант можа параўнаць з начыньнем, аб'ём якога зьмяншаецца, але ў якое ўліваецца штораз большая колькасьць вады» («Г. П.», 17 сьнежня).

Ваяўнічы орган фашызму на «крэсах» — «Кур'ер Віленскі» ў паніцы перад тварам грознай сапраўднасьці:

«З аднаго боку — мільёны людзей, пазбаўленых працы (бо гэтай працы няма каму купляць), галодных, незадаволеных, ахопленых роспаччу і гатовых на ўсё...

З другога боку — празьмернае накапленьне матар'ялаў і прадуктаў, якія зьнішчаюцца пазбаўленымі чалавечнасьці купцамі, бо цэны, на якія яны разьлічвалі, не зьяўляюцца даволі высокімі...» («К. В.», 15 сьнежня).

Ахоплены страхам, фашысцкі орган адкрыта агітуе за неабходнасьць

«... спыніць выраб машын, спыніць рамонт тых, якія цяпер працуюць...»

І так, чарговы «выхад» спойтзен. Ламі, руйнуй машыны — машына «корань зла». Прэч машыны, назад, хутчэй назад — крычаць зьдзічэлыя «цывілізатары» XX стагодзьдзя. Мала таго. На думцы «Кур'ера Віленскага» прычына крызісу хаваецца ў... «перапрадукцыі» людзей.

«Перапрадукцыя людзей асуджана на пагібель, або на стварэньне ў сваіх краінах рэвалюцыі і фэрмэнтаў, тым больш, што гэтыя людзі ўсьведамляюць тую крыўду, якая ім наносіцца».

Што-ж рабіць з «перапрадукцыяй» людзей? «Кур'ер Віленскі» робіць тут многазначны ківок у бок вайны: не пашкодзіць, калі па гэтай масе прагуляецца зьдань 1914 году:

«Сёньня мы бачым, што нават вайна, якая праглынула 9 мільёнаў людзей, не пакінула сьледу ў масы, зьвязанай са сваім існаваньнем, з сучаснымі ўмовамі працы».

У здагадлівага «Кур'ера Віленскага» ёсьць таксама «канкрэтная прапанова»:

«Народы і пасобныя сем'і павінны спыніцца на праблеме перапрадукцыі людзей. Бяссэнсоўна зьвярскі асуджаюць навінныя істоты на голад за тое, што яны ня могуць зьмясьціцца на сьвеце...»

Дзікая варажба «Кур'ера Віленскага» ня ў сілах, відома, спыніць няўхільнае нарастаньне эканамічнага крызісу. Кожны дзень прыносіць далейшае паглыбленьне крызісу. А ў пэрспэктыве — зіма, «самая чорная зіма капіталізму». У пэрспэктыве — пераход крызісу ў катастрофу.

Эканамічны крызіс стварае ўсе аб'ектыўныя ўмовы для нарастаньня прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу. Рэвалюцыйная актыўнасьць пралетарыяту Польшчы ўзьнімаецца на новую вышэйшую ступень. Бязупынна растуць сялянскія выступленьні па глебе аграрнага крызісу. На эксплёатацыю і падатковыя экзакуцыі сялянскія масы адказваюць мацутным рэвалюцыйным ацюрам. Паасобныя факты такога характару прабіваюцца нават і на старонкі прэсы:

«Паводле паведамленьня з Вільні, у Шымшанскай волясьці дайшло да бойкі паміж папіцыяй і натоўпам на фоне падатковай экзэкуцыі. У вёсцы Карпасічы экзэкутар хацеў забраць жывёлу. Сяляне супрацьпіліся, кідаючыся на сэкзэкутатара. Папіцыя была прымушана ўжыць зброю. На крык абараняючых свае маемасьць сабраліся сяляне вакольных вёсак і далі папіцыі адпор. Зроблены шматлікія арышты» («Роботнік», 19 сьнежня).

Аб нарастаньні **прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу** сьведчыць таксама ўздым нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі і Зах. Украіне.

Сацыяльная база фашызму скарачаецца, скарачаюцца прыводныя пасы фашысцкай дыктатуры да працоўных мас. Пралетарыят канцэнтруе вакол сябе і вядзе ў бой з кожным разам усё шырэйшыя масы.

Буржуазія ў трывозе перад фактам нарастаньня рэвалюцыйнага ўздыму. Польскі фашызм суднаражна прыводзіць у рух усе мэханізмы тэрору. Уся краіна пакрываецца лесам шыбеніц. Ваенна-палявыя суды з кожным днём узмацняюць сваю крывавую дзейнасьць. Буржуазія імкнецца залушыць рэвалюцыйныя сялянскія выступленьні на ЗБ і ЗУ мэтадам карных экспэдыцый.

Коціцца хваля яўрэйскіх пагромаў —сваласаблівай формы белага тэрору і наступленьня на рэвалюцыйнае адзівства пралетарскага інтэрнацыянальнага фронту ў Польшчы. Фашызм не шкодуе сіл, каб змайстраваць штучны клапан у дзяржаўным катле, якому пагражае выбух.

Наперакор фашысцкаму тэрору, наперакор карным экспэдыцыям і пагромам **расьце і мацнее рэвалюцыйны фронт пралетарыяту і сялянскіх мас пад кіраўніцтвам КПП.** Расхістваюцца «левыя» грамадзкоды фашызму — ППС, Бунд і г. д. Пралетарскі фронт у Польшчы, адбіваючы атакі азьвярэлага фашызму, пераходзіць у контрнаступленьне.

«Грозныя і панурныя сыгналы пачуліся. Нельга іх ігнараваць, — з трывогай ударае ў звон орган прамысловцаў — «КУР'ЕР ПОЛЬСКІ».

Трэба рашуча і сьмела зьнішчыць усякія выступленьні ня антыдзяржаўных вулічных банд, так і камунізуючых інтэлігентаў, якія атручваюць сацыяльную атмасфэру. Зіма павінна застаць урад і грамадзянства гатовымі на ўсякія няпрыемнасьці».

У гадавіну вядомай бойкі пад Варшавай «Кур'еру Віленскаму» мімаволі прынялося проціпаставіць дзьве сыстэмы — сыстэму капіталізму і сыстэму сацыялізму, проціпаставіць дзьве дыктатуры: дыктатуру фашызму і дыктатуру пралетарыяту:

«Трэба спыніцца на тым, наколькі за мінулыя 11 год узмацніліся яны там, на Прывісляцкіх стэпах, і наколькі мы? Колькі саюзьнікаў здабылі яны і колькі мы?»

У бясьсільнай злобе «Кур'ер Віленскі» вымушан прызнаць, што

«... на жаль, яны здабылі вельмі многа, здабылі шмат».

Краіна Саветаў з посьпехам завяршае пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. У Савецкім Саюзе асноўныя масы сялянства беспаваротна павярнулі на шлях сацыялізму. Калгаснае сялянства стала цэнтральнай фігурай зямляробства. На баку СССР — **сымпатыі шматмільённых рабоча-сялянскіх мас усяго сьвету,** а ў фашысцкай Польшчы

«... як 11 год назад, так і цяпер, мы стаім на небясьпечным бастыёне, — прызнаецца «Кур'ер Віленскі», **ПАД НАГАМІ ПАЛАЕ ЗЯМЛЯ...»**

Польская буржуазія ўгадае ў жах перад надыходзячай гістарычнай разьвязкай. Прэса ў замяшаньні. Слова крызіс стала сынонімам жыцьёвага страху. Крызіс, крызіс, крызіс... Газэтныя пісакі бездапаможна мітусяцца ў пошуках мер выратаваньня ад бязьлітасных ударaў крызісу. Меры выратаваньня самыя рознастайныя — ад... ужываньня асьпірыны да... лячэньня на курорце. Чарговае вынаходзтва польскага друку — «праблема нэрваў». «Нэрвы» сталі сваласаблівым цэнтрам увагі прэсы.

«ГАЗЭТА ВАРШАВСКА» пад грозным аншлягам **«КРЫЗІС ЗЬНІШЧАЕ НЭРВЫ»** заклікае ўсіх

«... ратавацца ад упадку сіл свяжасовым пячэньнем на курорце Гродзіск пад Варшавай».

«ГАЗЭТА ПОЛЬСКА» прапануе ня менш «радыкальныя» сродкі:

«... АД КРЫЗІСУ пачынае балець галава... Падатковыя справы прыносяць цяпер шмат клопот і дрэнна ўплываюць на самаадчуваньне. **УЖЫВАЙЦЕ АСЬПІРЫНУ.** Асьпірына спыніць боль галавы».

Нервы, крызіс, асьпірына і лячэньне на курорце, аднак, толькі заслона для сапраўдных мэт польскага фашызму. Буржуазія бачыць **АДЗІНЫ ВЫХАД З ТУПІКА Ў ВАЙНЕ.** І таму манчжурскі канфлікт уносіць сымпатычнае ажыўленьне ў лягер польскай ваеннічыны. Шум, узьняты вакол нэрваў, раптоўна пачынае пераходзіць на выразныя матывы інтэрвэнцыі. Акупацыя Манчжуры акрыляе надзеі польскага імпэрыялізму. Польскі буржуазны, фашысцкі і сацыял-фашысцкі друк ва ўвесь голас выхваляе японскіх акупантаў. Пачын робіць **«СЛОВО»:**

«Японія—гэта шпяхецкая мілітарная дзяржава... Мяшчанская Эўропа ня ўмее змагацца з БАЛЬШАВІЗМАМ.

... Маем моцнае перакананьне, што мілітарна-фэадальная Японія ВОЗЬМЕЦЦА ЗА ГЭТУ БАРАЦЬБУ ПЕРАМОЖНА, калі абставіны НАБЛІЗЯЦЬ момант разьвязкі...

Японія — адзіны збавіцель азіяцкага кантынэнту (ад чаго — зразумела — Рэд.).

Няхай жыве Японія! Ура! Ура! Ура!»

Ініцыятыву «Слова» сьпяшаюцца падхапіць сацыял-фашысты. У ПОППС — **«РОБОТНІК»** сацыял-фашысцкі абройносец Заромба выразна ставіць праблему інтэрвэнцыі:

«Здаецца нам усё гэта такім далёкім і чужым. Аднак... суседам Кітаю зьяўляецца Савецкая Расія. Мы — суседзі гэтай-жа Расіі.

...Польшча — сусед Савецкай Расіі з захаду. Такім чынам далёкія праблемы Кітаю робяцца блізкімі Польшчы».

Сацыял-інтэрвэнт заклікае польскую ваеннічыну быць напагатове. «Газэта Варшавска» ў сувязі з абвастраньнем становішча на Далёкім Усходзе акрыляецца надзеяй, што

«у манчжурскі канфлікт можа ўмяшацца Расія, што адразу дасьць яму характар вялікага здароньня ў сусьветнай палітыцы».

Крыху ніжэй ідзе зусім выразны заклік:

«Польшча павінна выкарыстаць новую сітуацыю для ўмацаваньня міру (?) на сваіх усходніх межах («ГВ», 14 сьнежня).

Падпальшчыкі вайны прапічацца. Міжнародны пралетарыят яшчэ вышэй узьнімае сваю клясавую пільнасьць і не дапусьціць ажыцьцяўленьня крывавых пляноў польскага імпэрыялізму.

Пакуль-жа польскі буржуазны друк, чакаючы, так сказаць, адпавядзнага моманту, ідзе адводу ватой энэргічна шукае мер і сродкаў выратаваньня капіталізму. Меры фабрыкуюцца без канца, але мэты не дасягаюць. Новыя тысячы рабочых апаўняюць рады беспрацоўных. Узьнімаецца новая хваля банкрутцтваў. Нарастае небясьпека інфляцыі...

Ні асьпірына, ні курорты не дапамогуць.

Пацыент безнадзейна хворы.

А. Карачун, А. Мітлін

Аб аднэй нацыянал-ухілісцкай вылазцы

На аснове шырокай прапрацоўкі **ЛІСТА ТАВ. СТАЛІНА «аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму»,** КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, разгарнула вялікую работу па выкрыцьці трацкісцкай кантрабанды на тэарэтычным і гістарычным франтах БССР. Партыйная арганізацыя ўскрывае і дае рашучы адпор «тэарэтыкам і гісторыкам», якія кантрабандным шляхам, карыстаючыся гнілым лібэралізмам некаторых часьцей партыі, працягвалі ў тэорыю розных хлам контр-рэвалюцыйнага трацкізму, ідэалізавалі люксэмбургізм, буржуазныя контрэвалюцыйныя партыі, узводзілі паклёпы на бальшавікоў, на Леніна.

Побач з гэтым, партыйная арганізацыя выкрыла канкрэтных посьбітаў «паўзучых» ухілаў. Ухілісты да вялікадзяржаўнага шавінізму — **Выдра і Вальфсон,** якія да сваіх тэарэтычных прац падышлі не з партыйных пазыцый, а з пазыцый ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, сустрэлі рашучы адпор з боку самых шырокіх партыйных мас.

Бюро ЦК КП(б)Б і прэзыдыум ЦКК у сваёй пастанове «аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні» абавязалі ўсе партарганізацыі: **«павысіць пільнасьць да вылазак і праяўленьняў вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і рэгулёзаваць яшчэ больш актыўную барацьбу з ім, наносячы рашучы ўдар па апартуністычным і абыватальскім прымірэнцтве да вялікадзяржаўнага ўхілу».** Адначасова бюро ЦК КП(б)Б і прэзыдыум ЦКК катэгарычна паляроздзілі партарганізацыі, што **«Разьбіты і скампрамэнтаваны ў вачох шырокіх мас працоўных контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратызм будзе выяўляцца як у старых, так і ў новых некалькі іншых формах.** Гэта патрабуе далейшага ўзмацненьня пільнасьці з боку ўсёй КП(б)Б да ўсякіх праяўленьняў у радах партыі ўхілу ў бок мясцовага беларускага шавінізму».

Нацыянал-дэмакраты і ўхілісты да беларускага шавінізму зараз не адважваюцца адкрыта выступіць супроць нацыянальнай палітыкі бальшавіцкай партыі. Яны, усяляк маскуючыся, пранікаюць працэнцуць у літаратуру, у гісторыю, на тэарэтычны фронт свае шавіністычныя «ідэйкі», «тэорыйкі» і «налажэньні». Як на адну з такіх спроб, мы маем на ўвазе ў даным артыкуле паказаць на кніжку **В. Шчарбакова «Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі і белапольская акупацыя».** Гэта кніжка выдавалася ДВВ у 1930 годзе, г. зн. калі КП(б)Б вяла самую жорсткую барацьбу супроць нацыянал-дэмакратызму. Аднак, гэта не пашкодзіла выдавецтву выпусьціць у сьвет палітычна-шкодную кніжку, якая груба скажае гістарычную сапраўднасьць, якая асьвятляе гісторыю Кастрычніцкай рэвалюцыі па Беларусі, выходзячы з ухілісцкіх пазыцый да беларускага шавінізму.

Беларускія нацыянал - дэмакраты прапаведвалі, што ўсе беларусы — гэта родныя браты, адна сям'я; 9-мілённая грамада беларусаў — гэта адзін працоўны сялянскі народ, што сярод гэтага народу няма ні буржуазіі, ні кулацтва. В. Шчарбакоў у сваёй кніжцы прабуе даць крытыку гэтай нацыянал - дэмакратычнай «тэорыі». Аднак, аўтар ня толькі ня выкрывае гэтых нацыянал-дэмакратычных «палажэньняў», а сам па сутнасьці справы скочваецца да іх. На 7-й старонцы ён піша:

«Сярод памешчыкаў шмат было палякаў, або зусім апалячаных беларускіх зямляўласьнікаў. Сярод гарадзкой і местачковай буржуазіі і дробней буржуазіі, рамесьнікаў, дробных гандляроў ПЕРАВАЖАЛІ ЖУРЭІ, потым ішлі палякі і рускія (дзе-ж беларусы — К. М.). Гарадзкі і вясковы пралетарыят пераважна складаўся з БЕЛАРУСАЎ, ПОТЫМ ішлі [illegible], журэі і рускія».

Што гэта, як не паўтарэньне залозных ужо знаёмых «тэорый», як не прапаганда, праўда, у некалькі замаскаванай форме, падклясавасьці беларускай нацыі.

Падыход да ацэнкі суадносін клясавых сіл у дакастрычніцкай Беларусі з ухілісцкіх пазыцый, прывёў аўтара і да ігнараваньня кіруючай ролі пралетарыяту і яго партыі ў рэвалюцыі да адмаўленьня гегемоніі пралетарыяту. У кніжцы пералічваецца колькасны склад сацыяльных праслоек на Беларусі. Рабочых фабрычных, —азначае аўтар, — было 86.000, сельска-гаспадарчых рабочых—да 300.000, адыходных на заработкі—да 700.000, рамесьнікаў — 200.000 чал. Такім чынам, было ня менш 1 млн. чалавек пралетарскіх і паўпралетарскіх мас.

«Гэта вялізарная маса—піша Шчарбакоў — зьяўлялася рэзэрвам рэвалюцыі».

Пралетарыят такім чынам, са сваёй партыяй на чале, па Шчарбакову, ня кіруючая сіла рэвалюцыі, а **толькі рэзэрв.** Больш пахабнага паклёпу на рабочую клясу БССР быць ня можа. Але аўтар ідзе далей. Ён асьвятляе справу так, што і бальшавіцкая партыя не апіралася ў рэвалюцыі на рабочую клясу, а калі і апіралася, то толькі між іншым, для павялічэньня сіл пралетарскай рэвалюцыі.

«Ня толькі сярод сялянскай масы бальшавіцкая арганізацыя і Менскі савет мабілізавалі сілу пралетарскай рэвалюцыі. Мабілізацыя гэтых сіл ішла і па лініі рабочай клясы».

У сьвятле гэтых фактаў тупога не разуменьня кіруючай ролі рабочай клясы і яе партыі ня дзіўна, што аўтар даходзіць да сьцьвярджэньняў аб стыхійнасьці ў нарастаньні сіл рэвалюцыі.

«Бальшавіцкія ідэі парою напаўстыхійна пранікалі ў масы (стар. 13). У Беларусі, а таксама і ў іншых часьцях былой царскай Расіі нарастала, як стыхія, разгортвацца масавы рух. У яго ўцягваюцца сялянскія масы, спачыня і потым сялянства». (стар. 17).

Гэта апошняя фраза ішчэ раз падкрэсьлівае, што аўтар яўна адмаўляе кіруючую ролю рабочай клясы ў рэвалюцыі, яўна не разумее ўзаемадносін пралетарыяту з сялянствам.

Кастрычнік на Беларусі зьявіўся сустаўной часткай Кастрычніцкай рэвалюцыі ва ўсёй былой Расіі. Пралетарыят усёй краіны быў адзіным у барацьбе за ўладу, за зьнішчэньне капіталізму.

Кастрычнік на Беларусі перамог толькі дзякуючы брацкаму падтрыманьню рабочай клясы БССР пралетарыятам усёй былой Расіі, толькі дзякуючы выразнай праграме бальшавізму і ленінскім лёзунгам рэвалюцыі. Гэта ня толькі не праходзіць суцэльнай ніткай праз зьмест брашуры, але аўтар «умудрыўся» паказваць разьвіцьцё рэвалюцыі ў Беларусі адарвана ад агульна-рэвалюцыйных падзей у Расіі. У выкладаньні падзей аўтар на працягу ўсяго часу падкрэсьлівае: — у Беларусі і ў Расіі, у Расіі і ў Беларусі і ня робіць нават спробы зьвязаць гэтыя падзеі, падаць разгортваньне іх на Беларусі на агульным фоне разьвіцьця Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Асьвятляючы гісторыю рэвалюцыі на Беларусі, В. Шчарбакоў ня толькі хоць у якой-небудзь меры не падкрэсьлівае перарастаньня буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў рэвалюцыю сацыялістычную, а зусім змазвае гэта важнейшае пытаньне.

Ён не паказаў, як «першая перарастае ў другую», як «другая мімаходам вырашае пытаньні першай» (Ленін).

Буржуазныя, дробна-буржуазныя і ўсякія нацыяналістычныя партыі, згуртоўваючы вакол сябе буржуазію і кулацкія элементы вёскі, усімі сіламі імкнуліся затаіць у крыві рабочых і працоўнага сялянства пралетарскую рэвалюцыю. Ідучы поруч з нямецкімі і белапольскімі акупантамі, уся гэта зграя імкнулася ператварыць Беларусь у калёнію то нямецкага, то ангельскага, то французкага, то польскага імпэрыялізму. Здавалася-б, што асьвятляючы гісторыю барацьбы рабочай клясы і працоўных мас сялянства за Кастрычнік на Беларусі, В. Шчарбакоў дасьць аб'ектыўнае асьвятленьне дзейнасьці буржуазных, дробна-буржуазных і нацыяналістычных партый. Але аўтар ня толькі гэтага не зрабіў, а наадварот, стаў на шлях яўнай ідэалізацыі дробна-буржуазных, нацыяналістычных партый.

«Аб чым агітуюць нацыяналісты на гэтых мітынгах? Перш за ўсё і амаль выключна толькі аб нацыянальнай зьвядомасьці беларускага народу; усюды і скрозь прапаведвалася толькі вось гэта абстрактная сьвядомасьць».

Якімі наіўнымі прадстаўляе Шчарбакоў буржуазных нацыяналістаў — агентуру польскага фашызму, якая імкнулася ўсімі мерамі і ўсімі сродкамі на тэрыторыі Савецкай Беларусі насадзіць памешчыцка - капіталістычную народную рэспубліку. Аўтар не паказвае Скірмунтаў, Радзівілаў, Сьветаполк-Мірскіх і інш. буйных памешчыкаў і фабрыкантаў, якія ідэйна натхняючы нацыянал-дэмакратаў Луцкевічаў, Лёсікаў, Цьвікевічаў і К-° усімі сіламі стараліся задушыць рэвалюцыйны рух.

«Калі-б беларускія нацыяналісты ІШЛІ З МАСАМІ, калі-б яны здолелі АРГАНІЗАВАЦЬ РЭАЛЬНУЮ СІЛУ І ВЫСТУПІЦЬ СУПРОЦЬ ЧАСОВАГА ЎРАДУ, а не ўпрошвацьяго і руйнавалі-б адзіны фронт гэтага ўраду, адзіны фронт капіталістычна-памешчыцкіх клас, яны-б аб'ектыўна грапі-б рэвалюцыйную ролю, НА ЖАЛЬ (падкрэсьлена ўсюды намі),мы гэтага за беларускімі нацыяналістамі ня бачылі, а мо' амаль на бачылі».

Гэта не палітычная наіўнасьць аўтара, а яўная спроба давесьці тое, што беларускія нацыяналісты былі здольны павесьці за сабой масы, здольны былі арганізаваць фронт памешчыцка-капіталістычных клас, здольны былі грапі рэвалюцыйную ролю. Нацыяналісты, будучы прадстаўнікамі капіталістаў і памешчыкаў, ня толькі не маглі выступаць супроць капіталістаў і памешчыкаў, а абараняючы іх інтарэсы ўжывалі ўсе меры для задушэньня рэвалюцыі.

Для нас зусім ясна, што гэта спроба прадыктавана аўтару яго шавіністычнымі настроямі, яго імкненьнем ідэалізаваць нацыянал-дэмакратызм.

Але гэтым аўтар не абмяжоўваецца. Шчарбакоў

АБ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧЫМ ПЛЯНЕ САЮЗУ ССР НА 1932 ГОД

(КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧЫБЫ)

Пастанова ЦВК С. С. С. Р.

Троці год пяцігодкі (1931 г.) быў годам новых посьпехаў і дасягненьняў рабочай клясы ў сацыялістычным будаўніцтве. Па гледзячы па невыстарчальна шпаркі рост асобных галін прамысловасьці, прамысловая прадукцыя ўзрасла ў 1931 г. на 20-21 проц. у параўнаньні з прадукцыяй 1930 г.

Такім чынам 1931 год быў годам далейшага магутнага ўздыму прамысловасьці пры ўзрастаючым запаздае прамысловай вытворчасьці ва ўсіх капіталістычных краінах. Разам з тым гэты год быў годам ліквідацыі беспрацоўя ў СССР пры катастрафічным росьце колькасьці беспрацоўных ва ўсіх буржуазных дзяржавах, годам значнага паляпшэньня бытавых умоў рабочых і далейшага павышэньня іх заработнай платы (на 18 проц.) пры надзвычайным пагоршаньні бытавых умоў і зьніжэньні заработнай платы рабочых у краінах капіталізму.

У адносінах сельскай гаспадаркі троці год пяцігодкі зьявіўся годам карэннай яе перабудовы, рашучай перамогі сацыялістычных форм сельскай гаспадаркі (калгасы, саўгасы) над формамі прыватна-ўласьніцкімі і разгрому капіталістычных элемэнтаў вёскі. Калектывізацыя ў вёсцы дасягнула 62 проц. усіх сялянскіх гаспадарак і ахапіла 79 проц. усіх сялянскіх пасеўных плошчаў, што азначае перавыкананьне пяцігадовага пляну калектывізацыі больш чым у тры разы. Гэта рашаючая акалічнасьць акрэсьліла той факт, што валавая прадукцыя збожжавых і тэхнічных культур, па гледзячы па засуху ў радзе асноўных раёнаў (Волга, Казакстан, Урал, Зах. Сібір), дала прырост у параўнаньні з 1930 г. на 6,5 проц., а таварная прадукцыя (па-давяснову зварот), судзячы па росьце загатовак збожжа і тэхнічных культур, вырасла на 9-10 проц.

Такім чынам мінулы год быў годам далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі ў СССР пры ўзрастаючым запаздае сельскай гаспадаркі ў капіталістычных краінах. Гэты год быў для СССР разам з тым годам канчатковага падрыву дыфэрэнцыяцыі ў вёсцы, ліквідацыі галечы і карэннага паляпшэньня матар'яльных умоў працоўных мас вёскі пры каласальным росьце дыфэрэнцыяцыі і зьбядненьня мільённых мас сялян у краінах панаваньня капіталу.

Дасягнутыя посьпехі ў галіне індустрыі і сельскай гаспадаркі забясьпечваюць выкананьне пяцігодкі за 4 гады і абумовілі завяршэньне пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюзу ССР падкрэсьлівае, што гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам гераічных намаганьняў рабочай клясы і працоўных сялян, вынікам іх спаборніцтва і ўдарніцтва, парэшце, вынікам правільнай палітыкі камуністычнай партыі СССР, вынікам барацьбы за бальшавіцкія тэмпы супроць апартунізму ва ўсіх яго відах.

Уздым прамысловасьці, зямляробства і іншых галін народнай гаспадаркі абумовіў далейшы рост народнага даходу СССР. У выніку 1931 г. народны даход павялічыўся ў параўнаньні з 1930 г. на 13-14 проц., у той час, як ва ўсіх капіталістычных краінах народны даход упаў за тойжа год на 10-20 проц.

Ня гледзячы на значныя посьпехі народнай гаспадаркі СССР, ня гледзячы на тое, што падобныя посьпехі зьяўляюцца недасяжным ідэалам для любой капіталістычнай краіны, ЦВК лічыць гэтыя посьпехі далёка невыстарчальнымі з пункту гледжаньня магчымасьцяй сацыялістычнай сыстэмы гаспадаркі.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт лічыць, што пры належным скарыстаньні магчымасьцяй сацыялістычнай гаспадаркі народная гаспадарка СССР магла-б даць больш высокія тэмпы росту. Асноўнай прычынай невыстарчальнага скарыстаньня гэтых магчымасьцяй трэба лічыць недахопы ў рабоце гаспадарчых арганізацый як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы і транспарце, недахопы ў арганізацыі працы на прадпрыемствах, недахопы ў арганізацыі зарплаты, неналаджанасьць канкрэтнага кіраўніцтва, адсутнасьць праверкі выкананьня, адсутнасьць належнай увагі да гаспадарчага разрахунку.

Барацьба з гэтымі асноўнымі недахопамі гаспадарчага кіраўніцтва, барацьба за зьніжэньне абязьлічкі, як у галіне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, так і ў галіне транспарту, барацьба за зьніжэньне ўраўнілаўкі ў заробку, барацьба за правядзеньне гаспадарчага разрахунку, барацьба за ўкараненьне канкрэтнага кіраўніцтва і праверкі выкананьня зьяўляецца той неабходнай прадпасылкай, без якой нельга ажыцьцявіць належнае скарыстаньне магчымасьцяй сацыялістычнай гаспадаркі і забясьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў росту.

Гэтыя задачы могуць быць выраблены толькі шляхам далейшага ўзмоцненага разгортваньня сацыялістычнай вытворчасьці і будаўніцтва, яшчэ больш настойлівай барацьбы за скарыстаньне наяўных у нас вялізарных унутраных рэсурсаў народнай гаспадаркі і ў першую чаргу разгортваньня важнейшых гаспадарчых галін—апалавай прамысловасьці, мэталюргіі, машынабудаўніцтва, перш за ўсё машынабудаўніцтва для чыгуначнага транспарту.

Усе сродкі і сілы рабочай клясы, матар'яльныя і грашовыя рэсурсы павінны быць перш за ўсё накіраваны па разьвіцьцё гэтых галін народнай гаспадаркі. Плян вытворства і будаўніцтва іншых галін, якія снабжаюць мэталюргію, апалавую прамысловасьць, машынабудаўніцтва і транспарт абсталяваньнем, сырцом і энэргіяй, павінен быць набудаваны так, каб усе патрэбы гэтых рашаючых галін народнай гаспадаркі былі задаволены поўнасьцю.

Раённае размяшчэньне новага будаўніцтва ва ўсіх галінах павінна плянавацца з улікам паскарэньня ўздыму адсталых нацыянальных раёнаў і стварэньня ў іх прамысловыхачагоў, большага скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў (прыродныя багацьці, с.-г. сырэц) новых раёнаў і палягчэньня работы чыгуначнага транспарту, што патрабуе далейшага ўзмацненьня ўвагі да раёнаў Сярэдняй Азіі, Казакстану, Сібіры, Далёкага Ўсходу.

Выходзячы з гэтага, ЦВК Саюзу ССР пастанаўляе:

I. Па прамысловасьці

1) Акрэсьліць для 1932 году прырост валавай прадукцыі дзяржаўнай прамысловасьці ў 36 проц., што азначае выкананьне пяцігодкі да канца чацьвертага году і дае перавышэньне даваеннага ўзроўню прамысловасьці амаль у 4 разы.

Прырост валавой прадукцыі па галінах прамысловасьці, якія вырабляюць сродкі вытворчасьці, акрэсьліць у 43 проц. і па галінах, якія вырабляюць прадметы пырокага спажываньня—29 проц.

2) Зацьвердзіць наступныя вытворчыя заданьні па важнейшых галінах прамысловасьці: каменнага вугалю—90 млн. тон, чыгуну — 9 млн. тон, сталі — 9,5 млн. тон, пракату — 6,7 млн. тон, у тым ліку якаснага пракату — 676 тыс. тон; машынабудаўніцтва — у разьмеры 6.800 млн. рублёў, у тым ліку с.-г. машын —940 млн. руб., трактараў—82.000 штук, аўтамабіляў — 73.000 шт., паравозаў — 1.300 шт., таварных вагонаў у двухвосьным вылічэньні—50.000 шт. (у тым ліку на заводах, якія знаходзяцца пад ведамам НКШЗ —9.000 шт.), бавоўняна-папяровых тканін — 3.061 млн. мэтраў, абутку —91,5 млн. пар, кансэрваў — 1.000 млн. банак.

У праграме машынабудаўніцтва поўнасьцю забясьпечыць патрэбу мэталюргіі, апалу і чыгуначнага транспарту ў абсталяваньні ў адпаведнасьці з устаноўленым плянам капітальных работ па гэтых галінах гаспадаркі.

3) Побач з максымальным разгортваньнем вуглядабычы і яе мэханізацыі ў Данецкім і Кузьнецкім басэйнах усямерна фарсаваць разгортваньне вуглядабычы ў іншых раёнах (Боравічы, Сярэдняя Азія, Усходняя Сібір, Далёкі Ўсход), у асаблівасьці па Ўрале і Падмаскоўным раёне, які ў найкарацейшы тэрмін павінен стаць асноўнай апалавай базай для Масквы і Маскоўскай вобласьці. У адпаведнасьці з гэтым устанавіць праграму вуглядабычы па Данбасе ў разьмеры 56 млн. тон, па Кузбасе — 11 млн. тон, па Масквугалі — 6 млн. тон, па Карагандзе — 2,5 млн. тон, па Усходсібвугалі—3,7 млн. тон, па Ўралвугалі—6 млн. тон, Дальвугалі — 3 млн. тон і Сярэдазвугалі — 1,5 млн. тон.

Праграму капітальных работ па каменнавугальнай прамысловасьці ўстанавіць на 1932 год у 810 млн. руб., прадугледзеўшы будаўніцтва новых капалень і тых, што рэканструюцца, на агульную магутнасьць 195 млн. тон вуглядабычы ў год, у тым ліку па Данбасе — у 87 млн. тон, па Кузбасе—у 43,7 млн. тон, па Падмаскоўным басэйне — у 11,8 млн. тон і па Карагандзе — у 10 млн. тон.

4) Па лініі разьвіцьця чорнай мэталюргіі забясьпечыць пуск у 1932 годзе 24-х доменных печаў з карысным абёмам у 22 тыс. куб. мэтраў, 64 мартэнаўскіх печаў з гадавой прадукцыйнасьцю ў 4.400 тыс. тон сталі, 12-ці электрапечаў, 7 блюмінгаў і 21 новага пракатнага стану.

У адпаведнасьці з гэтым устанавіць абём капітальных работ па чорнай мэталюргіі ў 1.800 млн. руб.

5. Давесьці да канца 1932 году агульную магутнасьць усіх электрастанцый краіны, якія дзейнічаюць, да 5,6 млн. квт., у тым ліку магутнасьць раённых станцый — да 3,15 млн. квт., забясьпечыўшы ўступленьне ў эксплёатацыю на працягу 1932 году новых магутнасьцяй на 1,5 млн. квт.

Выраб электрычнай энэргіі ў 1932 годзе ўстанавіць у разьмеры 17,0 мільярдаў кілёват-гадзін, забясьпечыўшы прырост вырабу электраэнэргіі на 6 мільярдаў квт.-гадзін. Выраб электрычнай энэргіі на раённых станцыях прыняць на 1932 год у 10 мільярдаў квт.-гадзін.

6) Абавязаць ВСНГ, Наркамснаб, НКШЗ, Наркамзем і іншыя гаспадарчыя наркаматы неадкладна правесьці самую дакладную праверку фактычных норм расходу апалу, мэталу і с.-г. сырцу як у вытворчасьці, так і ў будаўніцтве і ўстанавіць абавязковыя нормы расходу гэтых матар'ялаў, якія прадугледжваюць эканомію ў параўнаньні з 1931 годам ня менш 15 проц мэталу ў вытворчасьці, ня менш 20 проц. мэталю — у будаўніцтве, ня менш 10 проц. скарачэньня норм расходу апалу.

7) Павялічэньне ліку занятых рабочых акрэсьліць у буйной (цэнтральнай) сацыялістычнай прамысловасьці з 5.447.000 чалавек у 1931 годзе да 6.218.000 чалавек у 1932 годзе, што складае рост на 14 проц. у параўнаньні з 1931 годам.

8) Устанавіць рост заработнай платы ў 1932 годзе ў параўнаньні з сярэдняй гадавой заработнай платай мінулага году для прамысловых рабочых на 11 проц. і ў адпаведнасьці з гэтым акрэсьліць гадавы фонд заработнай платы рабочых па прамысловасьці ў 8.051 млн. руб., г. зн. павялічыць фонд заработнай платы на 1.690 млн. руб. у параўнаньні з мінулым годам.

9) Акрэсьліць рост прадукцыйнасьці працы ў прамысловасьці на 22 проц. у адносінах да сярэдняй гадавой 1931 году. Абавязаць гаспадарчыя арганізацыі строга сачыць за прывядзеньнем ліку рабочых у поўную адпаведнасьць з гэтымі заданьнямі па росьце прадукцыйнасьці працы.

10) Зьніжэньне сабекошту прадукцыі ў 1932 годзе па прамысловасьці акрэсьліць у 7 проц. супроць фактычнага сярэдняга гадавога сабекошту мінулага году.

11) Зацьвердзіць агульны абём капітальных работ па сацыялістычнай прамысловасьці ў разьмеры 10.700 млн. руб. супроць 8.200 млн. руб. у 1931 годзе.

II. Па сельскай гаспадарцы

1. Агульны разьмер пасеўных плошчаў і яравых культур давесьці ў 1932 г. да 102 млн. гэктараў супроць 97,4 млн. гэктараў веснавой сяўбы 1931 г. Пасеўную плошчу бавоўны ўстанавіць у разьмеры 2.437 тыс. гэктараў супроць 2.137 тыс. гэктараў у 1931 г., ільну (даўгунца) — 2.560 тыс. гэктараў супроць 2.338 тыс. гэктар., буракоў — 1.670 тыс. гэкт. супроць 1.649 тыс. гэктараў.

2. Плян азімых культур у 1932 годзе ўстанавіць у разьмеры 42 млн. гэктар. супроць 39,2 млн. гэкт., засеяных у 1931 г.

3. Вызначыць пасеўную плошчу ў 1932 г. (яравыя і азімыя) у саўгасах у разьмеры 14 млн. гэктараў. Пасеўную плошчу калгасаў устанавіць у разьмеры ня менш 108 млн. гэктараў, з іх яравых ня менш 76 млн. гэктараў. Пасеўную плошчу машына-трактарных станцый у 1932 годзе ўстанавіць у разьмеры 48 млн. гэктараў, з іх 33 млн. гэктараў яравых.

4. Паставіць задачай узьняцьце ўраджайнасьці аднаго гэктара збожжавых да 8,5 цент., цукровых буракоў — да 145 цент., бавоўны-сырцу ў паліўных раёнах Сярэдняй Азіі—да 8,7 цент., ільна-валакна — да 2,6 цент. і сланечніка — да 6 цент. з аднаго га.

5. Забясьпечыць снабжэньне сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці ў 1932 годзе ў наступных разьмерах:

а) трактарамі ўласнай вытворчасьці ня менш 1 млн. конскіх сіл;

б) снабжэньне сельгасмашынамі ўласнай вытворчасьці на суму 900 млн. руб., з іх большая частка—ўборачны інвэнтар.

6. Давесьці лік МТС Трактарацэнтру да 3.100 з магутнасьцю трактарнага парку ў 1.360 тысяч конскіх сіл, для чаго арганізаваць 1.700 новых машына-трактарных станцый.

7. Давесьці ў 1932 годзе стада Жывёлаводаб'яднаньня да 2.950 тыс. шт. супроць 2.100 тысяч шт. у 1931 годзе стада Сьвіноводаб'яднаньня — да 2.900 тысяч шт. супроць 1 млн. шт. у 1931 г.; стада Аўцаводаб'яднаньня — да 7.300 тысяч шт. супроць 4.780 тыс. шт. у 1931 г.; стада Маслааб'яднаньня — да 320 тысяч кароў супроць 216 тысяч у 1931 годзе.

Давесьці пагалоўе кароў у фэрмах Малакалгасцэнтру да 2.700 тысяч шт.; пагалоўе сьвіней у фэрмах Сьвіноводкалгасцэнтру — да 4,5 млн. шт.; пагалоўе Аўцаводкалгасцэнтру — да 9 млн. шт.

8. Здачу таварнай прадукцыі жывёлагалоўчымі саюзнымі трэстамі Наркамзему вызначыць у 162,2 тысячы тон мяса і 548 тысяч тон малака і здачу таварнай прадукцыі калгаснымі таварнымі фэрмамі вызначыць у 182 тысячы тон мяса і ў 1.375 тысяч тон малака.

9. Вызначыць у якасьці мінімальнага заданьня давядзеньне пасеваў кармовых культур да 7.900 тысяч гэктараў, засеву сіласных культур—да 1.200 тысяч га і забясьпечыць будаўніцтва сіласных вежаў, траншэй і ям у разьмерах, якія забясьпечваюць сіласаваньне ня менш 200 млн. цэнтнэраў сіласных культур.

10. Абём капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку (сацыялістычны сэктар) вызначыць у 4.360 млн. руб. супроць 3.600 млн. руб. у папярэднім годзе.

III. Па транспарце і сувязі

1. Устанавіць разьмеры капітальных работ па чыгуначным, водным, дарожным і паветраным транспарце па 1932 год у 3.330 млн. руб. з канцэнтрацыяй новых работ па чыгуначным транспарце на разьвіцьцё лініі Масква—Данбас, выхадаў з Данбасу і ліній Масква—Магнітагорск—Кузьнецк.

2. Устанавіць агульны лік рабочых па чыгуначным транспарце ў колькасьці 1.186 тысяч чалавек, рост заработнай платы ў параўнаньні з сярэдняй гадавой папярэдняга году на 13 проц., у адпаведнасьці з чым для 1932 году фонд заработнай платы на чыгуначным транспарце вызначыць у суме 1.494 млн. руб. супроць 1.315 млн. руб. у папярэднім годзе.

Зьніжэньне сабекошту перавозак на чыгунках вызначыць у разьмеры ня менш 10 проц. у параўнаньні з фактычным сабекоштам перавозак у 1931 годзе.

Нормы расходаў апалу на чыгунках скараціць ня менш чым на 9 проц. супроць фактычных норм расходу ў 1931 годзе.

3. Вызначыць рост работы сувязі ў 1932 годзе на 25 проц. супроць 1931 г., зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на паляпшэньне якасьці работы. Прырост ліку работнікаў сувязі на 1932 год зацьвердзіць у разьмеры 21 проц. супроць сярэдня-гадавога ліку 1931 г. і заработнай платы — на 10,3 проц.

IV. Па камунальнай і жыльлёвай гаспадарцы

Зацьвердзіць агульны абём капітальных укладаньняў у гарачэкое жыльлёвае будаўніцтва па аграмаджаным сэктары народнай гаспадаркі ў 1.942 млн. руб. і ў камунальную гаспадарку і дабрабыт у разьмеры 950 млн. руб., што складае больш, чым падваеньне супроць укладаньняў у 1931 годзе.

Сканцэнтраваць асноўную частку капітальных укладаньняў на камунальнае жыльлёвае будаўніцтва ў вугальна-мэталюргічных раёнах, у Маскве, Ленінградзе і асноўных новых прамысловых раёнах.

V. Па снабжэньні

1. Вызначыць фонд тавараў шырокага спажываньня для снабжэньня насельніцтва ў 1932 годзе па раздробных цэнах 1931 г. у 35.500 млн. руб. супроць 27.200 млн. руб. у 1931 г., што павялічыць сацыялістычны сэктар раздробнага звароту на 30 проц. у 1932 годзе супроць 1931 г.

2. Шырока разгарнуць у 1932 годзе капітальнае будаўніцтва лёгкай прамысловасьці і харчовай індустрыі. Прыступіць да пабудовы новага магутнага тэкстыльнага камбінату ў Сярэдняй Азіі для пераапрацоўкі сярэдняазіяцкай бавоўны і снабжэньня тканінамі насельніцтва Сярэдняй Азіі і Сібіры.

Фарсаваць будаўніцтва буйных мясных камбінатаў у Маскве, Ленінградзе, Сімферопалі, Орску і пачатых сярэдніх мясакамбінатаў; прыступіць да пабудовы ў 1932 годзе пяці сярэдніх і 11 дробных мясакамбінатаў. Побач з прыцягненьнем і скарачэньнем будаўніцтва пяці цукровых заводаў пачаць будаўніцтва 13 новых цукровых заводаў і саўгасаў для снабжэньня іх сырцом, з іх ня менш 11 у новых раёнах (Казакстан, Далёкі Ўсход). Дабудаваць у 1932 годзе сем пачатых кансэрвовых заводаў і пабудаваць у 1932 годзе 6 кансэрвовых заводаў і два шкло-тарных заводаў для вырабу рыбных, гародных і мясных кансэрваў.

3. Абавязаць Наркамснаб, Цэнтрасаюз, ВСНГ і Наркамзем шырока разгарнуць у 1932 годзе будаўніцтва магазынаў у гарадох і вёсцы, максымальна набліжаючы пункты продажу тавараў да спажыўца, у прыватнасьці абавязаць Наркамснаб і Цэнтрасаюз адкрыць у 1932 годзе дадаткова 10 тыс. магазынаў (па 5 тысяч кожнаму з іх) з тым, каб магазыны Наркамснабу былі адкрыты ва ўсіх раённых цэнтрах і ў правінцыяльных прамысловых пунктах.

VI. Па працы, кадрах і культуры

1. Вызначыць для 1932 году павялічэньне ліку рабочых і служачых па ўсёй прамысловасьці, транспарце, сельскай гаспадарцы (саўгасы) і іншых галінах народнай гаспадаркі да 21.000 тыс. чал. супроць 18.700 тыс. чалавек у 1931 годзе.

2. У адпаведнасьці з заданьнямі пляну па павышэньні заработнай платы ў асобных галінах народнай гаспадаркі, вызначыць гадавы фонд заработнай платы рабочых і служачых усіх галін народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва на 1932 год у 26.800 млн. руб. супроць 21.100 млн. руб. у 1931 г.

3. Агульны абём усіх затрат на культурна-сацыяльныя патрэбы насельніцтва (асьвета, кадры, навука, ахова здароўя, сацыяльнае забясьпячэньне, ахова працы, дапамога па сацыяльным страхаваньні) вызначыць у 1932 годзе ў 9.200 млн. руб. супроць 6.600 млн. руб. у папярэднім годзе. У тым ліку:

а) Суму ўсіх затрат на падрыхтоўку кадраў вызначыць на 1932 г. у 2.795 млн. руб., у тым ліку на капітальнае будаўніцтва ў 445 млн. руб.

б) Суму ўсіх затрат на масавую асьвету вызначыць у 2.618 млн. руб., у тым ліку на капітальныя ўкладаньні ў 476,1 млн. руб.

в) Суму ўсіх затрат на навукова-дасьледчыя ўстановы і работы вызначыць у 646 млн. руб., у тым ліку на капітальнае будаўніцтва 170 млн. руб.

г) Суму ўсіх затрат на ахову здароўя, уключаючы фізкультуру, зацьвердзіць у 1.737 млн. руб., у тым ліку на капітальныя затраты ў 310 млн. руб.

4 Гадавы бюджэт сацыяльнага страхаваньня рабочых і служачых на 1932 год вызначыць у 3.490 млн. руб. супроць 2.500 млн. руб. у 1931 годзе.

5. Вызначыць выпуск у 1932 годзе наступных кантынгентаў скончыўшых навучальныя ўстановы: з ВНУ—56 тыс. чал., з тэхнікумаў — 175 тыс. чал., з рабфакаў —121 тыс. чал., з школ фабрычна-заводзкага вучнёўства — 364 тыс. чал.

VII. Па агульным аб'ёме капітальнага будаўніцтва

1. У адпаведнасьці з асноўнымі задачамі народна-гаспадарчага пляну на 1932 г. зацьвердзіць агульны аб'ём капітальных укладаньняў у аграмаджаны сэктар народнай гаспадаркі ў разьмеры 21,1 млрд. руб. супроць 16.1 млрд. руб. капітальных укладаньняў у 1931 год.

2. Зьніжэньне сабекошту будаўніцтва ўстанавіць у 1932 г. ня менш чым на 10 проц. у параўнаньні з фактычным коштам будаўніцтва ў 1931 годзе, у тым ліку зьніжэньне сабекошту чыстага будаўніцтва ня менш чым на 17 проц.

3. Абавязаць ўсе гаспадарчыя наркаматы і рэспублікі дабіцца ў 1932 годзе максымальнай эканоміі ў выдатках на будаўнічых матар'ялаў, шырокага разгортваньня вырабу і ўкараненьня мясцовых і новых будаўнічых матар'ялаў, рацыянальнага скарыстаньня рабочых рук у будаўніцтве, рашучага зруху ў скарыстаньні мэханізму на будаўніцтве, зьнішчэньня лішніх запасаў трываласьці, якія падаражаюць кошт капітальных работ.

4. Устанавіць сярэднюю гадавую колькасьць занятых на працягу 1932 году у будаўніцтве рабочых у колькасьці 2.719 тыс. чал. пры росьце заработнай платы на 5,6 проц. супроць сярэдняй гадавой заработнай платы ў 1931 годзе.

5. Народны даход СССР у 1932 г. вызначыць у разьмеры 49,2 мільярда руб. супроць 37,8 млрд. руб. 1931 году, што азначае рост народнага даходу ў 1932 г. на 30 проц. у параўнаньні з папярэднім годам, з тым, каб удзельная вага сацыялістычнага сэктару гаспадаркі ў народным даходзе ў 1932 г. складала 91 проц. супроць 81,5 проц. у 1931 годзе.

6. Зацьвердзіць дзяржаўны бюджэт на 1932 г. па даходах у суме 27.429 млн. руб. і па расходах у суме 26.929 млн. р. са стварэньнем дзяржаўнага рэзэрву ў разьмеры 500 млн. руб. супроць 20,5 млрд. руб. па даходах і расходах у 1931 г.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва поўнасьцю і канчаткова забясьпечылі перамогу сацыялізму ў нашай краіне. Выкананьне народнагаспадарчага пляну 1932 г., якое азначае сканчэньне пяцігодкі за 4 гады, будзе вялізарнейшым посьпехам у барацьбе з капіталістычным акружэньнем і вялізарнейшай перамогай ня толькі рабочай клясы СССР, але і ўсяго міжнароднага пралетарыяту.

Дасягненьне абсалютнай перавагі сацыялістычнага сэктару ў сельскай гаспадарцы, якое зьяўляецца вялізарнейшай сусьветнай гістарычнай перамогай сацыялізму, азначае вялізарнае ўзмацненьне магутнасьці рабочай клясы СССР і вялізарны рост аўтарытэту савецкай улады сярод працоўных усяго сьвету, што, у прыватнасьці знайшло адлюстраваньне ў пераломе сярод інтэлігенцыі і ў тым ліку сярод інжынэрна-тэхнічных кадраў. Побач з разгорнутай барацьбой за аўладаньне тэхнікай, нашай задачай зьяўляецца канчатковае замацаваньне гэтага пералому пры адпаведнай бальшавіцкай барацьбе са шматлікімі яшчэ праяўленьнямі супраціўленьня з боку клясавага ворага.

Плян гаспадарчага будаўніцтва на 1932 г. акрэсьлівае згуртаваньне намаганьняў рабочай клясы па выкананьні карэнных гаспадарчых задач,—па падняцьце мэталюргіі, апалу, машынабудаўніцтва, транспарту. Пры гэтым неабходна такое разгортваньне ўсяго капітальнага будаўніцтва, якое-б забясьпечыла паскарэньне пуску пачатых важнейшых пабудоў і пуску ў 1932 г. найбольшай колькасьці новых прадпрыемстваў.

Для забясьпячэньня выкананьня гэтага гаспадарчага пляну неабходна сваячасовае правядзеньне дагаворнай кампаніі і суровая дысцыпліна ў выкананьні дагавораў паміж гаспадарчымі арганізацыямі.

Важнейшае значэньне мае зьнішчэньне на справе недахопаў у арганізацыі працы і, перш за ўсё, у ліквідацыі абязьлічкі і выгнаньні з практыкі ўраўнілаўкі ў аплаце працы. Побач з гэтым неабходна павончыць з пагардлівымі адносінамі да дзейнічаючых заводаў, ва ўгоду перакавялічаным патрабаваньням новых пабудоў, як зьвяшчам зусім нецярпімым. Указаньні партыі ў адносінах усіх гэтых задач павінны праводзіцца з усёй рашучасьцю і з належным вучотам асаблівасьцяй паасобных вытворстваў і раёнаў.

ЦВК Саюзу лічыць, што ў цэнтры ўвагі ўсіх савецкіх і гаспадарчых органаў (ВСНГ, НКСнаб, НКШЗ, Наркамзем, гаспадарчыя аб'яднаньні і г. д.) павінна быць пастаўлена праверка выкананьня пастаноў партыі і ўраду і іх уласных пастаноў. Практычная работа ўсіх савецкіх і гаспадарчых органаў павінна быць праведзена з роек дэкрэтна-дырэктыўных пастаноў і распараджэньняў на рэйкі сыстэматычнай праверкі выкананьня на справе даных падпарадкаваным органам заданьняў.

Бальшавіцкая мабілізацыя сіл рабочай клясы, далейшае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва зьяўляюцца асноўнай прадпасылкай выкананьня задачы поўнага сканчэньня пяцігодкі ў 1932 г. Апіраючыся на шматмільённыя масы калгаснага сялянства, рабочая класа Савецкага Саюзу выкананьне гэтай гістарычнай задачы зробіць справай свайго гонару.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР,
Г. ПЯТРОЎСКІ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР,
А. ЕНУКІДЗЭ.

Масква. Крэмль.
25-га сьнежня 1931 г.

БССР БУДЗЕ КРАІНАЙ СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЬЦІ

РАЎНЕНЬНЕ НА ПЕРАДАВЫЯ РАЁНЫ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЎСЕАГУЛЬНАЕ НАВУЧАНЬНЕ І ЛІКВІДАЦЫЮ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ

Адтэрмінаваньняў ня будзе

Воляй і энтузіязмам, гераічнай работай пралетарыяту і ўсіх працоўных, пад ленінскім кіраўніцтвам КП(б)Б, Савецкая Беларусь ператвараецца ў рэспубліку суцэльнай пісьменнасьці. Такой яна павінна стаць да 1 мая 1932 году.

У 1931 годзе на БССР ужо ахоплена навучаньнем 95 проц. усіх дзяцей школьнага ўзросту. Дзесяткі тысяч няпісьменных і малапісьменных займаюцца на лікпунктах і ў розных вячэрніх школах, перамагаюць сваю цемру, павышаюць свой культурны ўзровень.

Дасягнуты вялізарныя посьпехі на фронце барацьбы за ператварэньне БССР у рэспубліку суцэльнай пісьменнасьці. Канчатковая перамога тут забясьпечана пасьпяховым ажыцьцяўленьнем пяцігодкі за чатыры гады, пасьпяховай сацыялістычнай рэканструкцыяй усёй народнай гаспадаркі.

Такі бурны рост пісьменнасьці, такое шырокае разгортваньне барацьбы за культурны рост працоўных мас, рост пралетарскай культуры магчымы толькі пры дыктатуры пралетарыяту і савецкай уладзе, магчымы толькі ў выніку няўхільнага ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі і барацьбы з усякімі ўхіламі і скажэньнямі лініі партыі.

У барацьбе за суцэльную пісьменнасьць першымі ідуць Гомель, Плешчаніцы, Горкі. У гэтых раёнах навучаньнем ахоплены ўсе 100 проц. няпісьменных дарослых і дзяцей школьнага ўзросту, замацавана наведваньне лікпунктаў, школ і г. д. Па Гомелі, Плешчаніцах і Горках павінны раўняцца і ўсе астатнія раёны БССР.

Выхад аднай з самых адсталых у мінулым частак царскай Расіі—Беларусі—у перадавікі рэспублік Савецкага Саюзу—найлепшая, з усёй глыбінёй пераконваючая ілюстрацыя перамогі ленінізму-бальшавізму.

Да 1 мая застаецца толькі 4 месяцы. Час больш чым малы. Адтэрміновак у пагалоўнай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўных мас рэспублікі ня будзе.

Ня гледзячы на ўсё гэта, становішча барацьбы за суцэльную пісьменнасьць у паасобных раёнах ставіць пад яўную пагрозу зрыву ў іх гэтай важнейшай палітычнай задачы, ставіць пад пагрозу невыкананьне дырэктыў партыі. Пра гэта гаворыць тыя матар'ялы з раёнаў, якія друкуюцца ў сёпешнім нумары «Зьвязды».

Указаньне Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, зробленае ў лісталадзе месяцы спэцыяльнай пастановай аб тым, што раённыя партыйныя арганізацыі нясуць поўную адказнасьць за работу па ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці, абавязвае партыйныя ячэйкі, партыйныя камітэты на мясцох яшчэ больш узмацніць сваю канкрэтную дапамогу, сваё канкрэтнае кіраўніцтва работай па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Камсамол—пэф над работай на ліквідацыі няпісьменнасьці і ўсеагульным навучаньні, а таксама прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі не заўсёды праяўляюць максымум увагі і клопатаў у барацьбе за суцэльную пісьменнасьць рэспублікі.

Тыя чатыры месяцы, якія адлучаюць нас ад 1-га мая, павінны стаць, асабліва і ў першую чаргу для адсталых раёнаў, месяцамі штурму, месяцамі ўдарнай бальшавіцкай работы па падцягваньні адсталых вучастка ў да перадавых раёнаў рэспублікі.

Ліквідацыя няпісьменнасьці зьяўляецца ў сучасны момант адной з самых першачарговых задач партыі. Па тым, як будзе выкананая задача ліквідацыі няпісьменнасьці, будзе правяраецца працаздольнасьць партыйных арганізацый і ячэек.

Савецкая Беларусь да 1-га мая павінна прыйсьці краінай суцэльнай пісьменнасьці!

Пераключыцца на адсталы вучастак

У вёсцы Гудовіч і Верхмен, Карзуноўскага сельсавету (Пухавіцкі раён) ёсьць яшчэ шмат няпісьменных і малапісьменных як дзяцей школьнага ўзросту, так і дарослых.

У гэтых дзьвёх вёсках налічваецца 50 дзяцей, не ахопленых школай. У адных толькі Гудовічах ва ўзросьце да 40 год налічваецца 40 чалавек малапісьменных і 58 чал. зусім няпісьменных.

Прайшло ўжо тры месяцы з пачатку навучальнага году, а ў Гудовічах і Верхмене яшчэ зусім ня браліся за работу па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

На агульных сходах гэта пытаньне ўжо некалькі раз узнімалася саміні няпісьменнымі і вясковымі актывістамі. Рабіліся пастановы, некалькі раз прасілі старшыню Карзуноўскага сельсавету, каб той дабіўся перад раённымі арганізацыямі дапамогі. Зруху ніякага і да сёпешняга дня няма. Гудовічы і Верхмен — амаль самыя адсталыя вучасткі ў пісьменнасьці ў Пухавіцкім раёне.

Раённым і сельсавецкім установам і арганізацыям, асабліва райпалітасьвеце, трэба зараз-жа пераключыцца на разгортваньне работы па ліквідацыі няпісьменнасьці ў Гудовічах і Верхмене.

Свой.

Замацаваць першыя посьпехі

КРУПКІ. (Наш кар.)

Партыйная і камсамольская ячэйкі Шэйскага сельсавету ў пачатку навучальнага году не прынялі літаральна ніякіх захадаў да арганізацыі работы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Да апошняга часу на сельсавеце нават ня было праведзена ўліку няпісьменных і малапісьменных.

Зараз грамадзкасьцю сельсавету абвешчан і праводзіцца двухдэкадзнік штурму. Двухдэкадзнік ужо даў першыя бліскучыя вынікі. Лікпунктамі ахоплена больш 70% усіх няпісьменных. Дасягнута сыстэматычнае навучаньне калгаснікамі і беднякамі—адпаасобнікамі лікпунктаў і школ малапісьменных. Для работы ў школах прыцягнуты камсамольцы, вучні сямігодкі і настаўнікі.

Партыйная і камсамольская ячэйкі змагаюцца за 100 проц. ахоп лікпунктамі ўсіх няпісьменных за суцэльную пісьменнасьць насельніцтва сельсавету.

В. Ісяндзэў.

Дырэктывы партыі ня выконваюцца

На мзблевай фабрыцы (Бабруйск) налічваецца каля 70 няпісьменных, з якіх толькі 50 ахоплены навучаньнем у лікпунктах. Наведваньне дасягае ня больш 35-40 проц.

На буйнейшым прадпрыемстве Бабруйску—дрэваапрацоўчым камбінаце —ёсьць 263 няпісьменныя і 899 мала пісьменных рабочых. Школамі і лікпунктамі ахоплен зусім нязначны процант няпісьменных і малапісьменных, які ледзь дасягае 10-15.

Заняткі ў школах і лікп

Новыя японскія дывізіі—у Манчжурыю

Баі за Цзіньчжоу ня спыняюцца

Напружанае становішча ў Цзяньцзіне

ТОКІО, 27. Дайрэнцкі карэспандэнт газэты «Асахі» паведамляе, што Хондзіё выдаў загад дывізіі Тамона і войскам Паўднёва-Манчжурскай чыгункі выступіць у раён, што на захад ад ракі Ляо. Другі карэспандэнт гэтай-жа газэты з Хайчэну піша, што для ўдзелу ў ваенных апэрацыях на захад ад ракі Ляо дывізія Тамона выступіла ў паход. 25 сьнежня адна брыгада накіравана ў Інкоў. 26 сьнежня адзін полк з Інкоу, другі з Хайчэну адпраўлены на поўдзень.

Агенцтва Сімбун Рэнга з Інкоу паведамляе, што ўлора ў Інкоу прыбылі тры японскія вайсковыя групы.

Паводле вестак з Мукдэну, 26 сьнежня адзначаліся баі ў Анчжуанцзане. Японская брыгада з Сынпінгаю перакінута праз Мукдэн у раён Андунь-Мукдэнскай чыгункі.

Гэта-ж агенцтва з Мукдэну паведамляе, што актыўнасьць «бандытаў» у зоне чыгункі Тунляо—Чжэнцзятунь узмацнілася. Недалёка ад Тунляо ўчора разбурана чыгуначнае палатно. У рэзультаце прыбыцьця японскіх папаўненьняў у Цяньцзінь сітуацыя стала надзвычай напружанай. Кітайская ўлада абвясьціла стан аблогі і будуе ўмацаваньні. Улада надзвычай занепакоена прыбыцьцём японскіх ваенных аэраплянаў (ТАСС).

Гаміндан выратоўвае свой прэстыж

ШАНХАЙ, 26. Лічачы, што японцы любой цаной прабуюць захваціць Цзіньчжоу, нова-выбраны цэнтральны выканаўчы камітэт гаміндану ад імя пленуму, які адбываецца ў Панкіне, патрабаваў, каб Чжан Сюэ-лян аказаў узброенае супраціўленьне ў выпадку атакі японскімі войскамі Цзіньчжоу. Некаторыя ваенныя лідэры патрабавалі ад Панкіну прыняць такія крокі. Ад Фынь Юй-сяна атрымана тэлеграма, у якой ён патрабуе абароны Цзіньчжоў.

Супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі абвастраюцца

ШАНХАЙ, 26. Сёньня дыпляматычная камісія пры панкінскім урадзе абгаворвала японскае патрабаваньне аб прадастаўленьні рухомага склату для перавозкі войск у Цзяньцзін. Камісія інструктавала кітайскія ўлады ў паўночным Кітаі адхіліць японскія патрабаваньні. Атначасова камісія зрабіла прадстаўленьне пасольству ПАЗШ, зазначаючы, што Кітай, адхіляючы японскае патрабаваньне, не парушае пратаколу 1931 г., але аказвае толькі супраціўленьне пасылцы «карных войск» у Цзяньцзін.

Акупанты вызвалілі арыштаваных белагвардзейцаў

БЭЙПІН, 26. Як паведамляюць з Харбіну, на патрабаваньні японскага галоўна - начальствуючага асобным раёнам Усходняй правінцыі, Чжан Цзінь-туй спыніў справу пададўна арыштаваных лідэраў белагвардзейскай групы Амурскага казацтва Ушакова, Крукава, Лалеціна і інш. Белагвардзейцы зараз-жа былі вызвалены з-пад арышту нібы на парукі. Як вядома, Ушакоў быў арыштаваны на Заходняй лініі КУЧ і ў часе вобыску ў яго быў знойдзен ліст японскай ваеннай місіі (ТАСС).

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б АД 25-га СЬНЕЖНЯ 1931 Г.

АБ ПАЛІТЫЧНАЙ ПАМЫЛЦЫ ГАЗЭТЫ «ОРКА»

1. Адзначыць, што рэдакцыя газэты «ОРКА» ня толькі не дала матар'ялаў і артыкулаў па пытаньнях барацьбы з люксэмбургіянствам і трацкісцкай кантрабандай, але не перадру кавала прамовы тав. Кагановіча. Угледжваючы ў гэтым грубую палітычную памылку і ігнараваньне простых указаньняў партыі прапанаваць рэдакцыі газэты «Орка» апублікаваць прамову тав. Кагановіча і разгарнуць барацьбу супроць працягваньня трацкісцкай кантрабанды.

2. Абавязаць цэнтральны і раённы друк БССР узмацніць на сваіх старонках барацьбу з выкрыцьцём трацкісцкай кантрабанды, з праяўленьнямі гнілога лібэралізму, за выкананьне тых задач, якія пастаўлены тав. Сталіным у яго лісьце ў часопісі «Пролетарская Революция».

3. Прыняць да ведама паведамленьне рэдакцыі газэты «Рабселькор» аб зьмяшчэньні ў чарговым нумары газэты аглядаў друку і інш. матар'ялаў па пытаньні задач пізавога друку ў зьвязку з лістом тав. Сталіна.

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі

„Бальшавік" не здае тэмпаў

За пятую пяцідзёнку сьнежня завод «Бальшавік» выканаў вытворчую праграму (колькасна) на 102,1 проц. На першым месцы, як і раней, ідзе першы хромавы цэх.

Прамфінплян за 25 дзён сьнежня выкананы на 105,5 проц.

Рамонт вагонаў на заводзе „Полымя рэвалюцыі"

Паводле пляну завод «Полымя рэвалюцыі» павінен выпускаць кожны дзень з капвэнцыйнага рамонту 12 таварных вагонаў. 21-га сьнежня адрамантавана 6 вагонаў, 22-га—4, 23-га—5, 25-га—4 і 26-га—2. Сюды не ўваходзіць зроблены ў гэты час аварыйны рамонт трох вагонаў.

Забясьпечыць воскамбінат сырцом

ГОМЕЛЬ. У Гомелі будуецца зараз мэханізаваны воскамбінат.

Апошні будзе пераапрацоўваць, паводле ўдасканаленай тэхнікі, васковы сырэц у воск, надзвычай патрэбны для экспарту і для вырабу штучнай вашчыны. Ужо прыбыла абсталяваньне для камбінату.

Паводле пляну камбінат павінен вырабляць мэханізаваным шляхам адну тону штучнай вашчыны за 8 гадзін. Для выкананьня гэтага заданьня трэба поўнасьцю забясьпечыць прадпрыемства сырцом. Аднак, загатоўкі васковых согаў па БССР праходзяць нездавальняюча. На 20-га сьнежня загатоўлена каля 20 тон замест 40 паводле пляну. Васковы сырэц у раёнах разбазарваецца на выраб гуталіну, вазэлі, памады, для навощваньня падлогі і г. д.

Каб не сарваць работу камбінату, неабходна фарсаваць загатоўкі сырцу.

Работа „Камунара" за сьнежань

Завод «Камунар» за 20 дзён сьнежня выпусьціў прадукцыі на 93.057 рублёў. Выпушчана 38 сьвідравальных варштатаў, 101 варштат Сьмірнова, 1.130 цісковў, 800 дзёнак, 7 кувырак, 37 скатаў і г. д.

Магнітагорскі кокса-хэмкам бінат уступае ў строй „518"

МАГНІТАГОРСК. Ударнікі Магнітагорскага кокса-хэмкамбінату прыступілі да загрузкі коксавых печаў. Апошняя дзката прайшла ў жорсткім штурме непаладак; калектыў поўнасьцю аўладаў складанай тэхнікай пуску самага вялікага ў Эўропе кокса-хэмічнага камбінату.

Камбінат—адзін з гігантаў Урал-Кузбасу—уступае ў строй «518».

НА БЕЛДРЭСЕ

За апошнія дні Асінторф зноў зьнізіў тэмпы работы. Працуюць толькі 2 паравозы, з якіх адзін патрабуе рамонту. Падача торфу зьменшылася на 60-70 проц. 20-га сьнежня два паравозы падвозілі 420 тон торфу ў дзень, 26 сьнежня падвезена 130 тон, 27-га —145 тон. Абавязацельства Асінторфу—стварыць да 1-га студзеня запас з 7.000 тон—ня выканана.

Здавальненьне спажыўцоў энэргіяй Белдрэсу наогул бесьперабойнае, пасобныя лініі за апошнія дні выключаліся ня больш, чым на 10-15 мінут.

Брыгада «Зьвязды»:
Кілер, Дашкевіч.

Паведамленьні

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68). 28 сьнежня, у 7 г. увечары, У. Галубок чытае новую п'есу, па якой адбудзецца шырокае абгаварэньне.

Уваход вольны.

Запрашаюцца пісьменьнікі, рабочыя літтурткоўцы, члены крытычнай сэкцыі, артысты, масткі, студэнты.

МенАПП.

— Сёньня, 28-XII, у 7 гадз. веч., у аўд. 302 галоўнага корпусу БДУ будзе прачытана лекцыя праф. Панкевіча на тэму: «Ліст т. Сталіна і задачы на пэдагагічным фронце». Рабочыя і асьветнікі праходзяць на разданых білетах на 25-XII.

— 28 сьнежня, у 19 гадз., у Камвузе (аўд. № 25, 2-гі паверх) адбудзецца агульны сход т-ва марксыстаў—дзяржаўнікаў (перанесены з 25-XII на прычыне сходу ставуховых працаўнікоў гораду). Парадак сходу: 1) Абгаварэньне ліста т. Сталіна. 2) Рознае. Прысутнасьць членаў т-ва абавязкова. Запрашаюцца члены прайцэньня інстытуту сац. буд. і права БАН, работнікі савецкіх устаноў, студэнты камвузу і інстытуту сац. буд. і права, асьпіранты БАН.

— 31 сьнежня, у 10 гадз. раённы, у залі пасяджэньня СНК адбудзецца чарговае пасяджэньне ўсебеларускага штабу садзейнасьці лесазагатоўкам, вывазцы дроў, торфу і лесаматар'ялаў пры СНК БССР. У парадку дня — даклады раённых штабаў садзейнасьці пры РВК — Асіпавіцкага, Бабруйскага, Рэчыцкага, Гомельскага, Барысаўскага, Смалявіцкага, Аршанскага, Гродзенскага, Быхаўскага, Дубровенскага, дырэктароў лесправмгасаў вышэйпаказаных раёнаў за выключэньнем Дубровенскага і дырэктароў торфзаводаў: «Беларусі» — Бабруйск, «Шлях сацыялізму» — Гомель «Чырвоны Кастрычнік» — Барысаў, «Чырвоны сьцяг» —Смалявічы, Асінторф — Дуброўна. — аб ходзе выкананьня плянаў лесазагатовак, вывазцы дроў і лесаматар'ялаў і судаклады асоба-упаўнаважаных усебеларускага штабу. Яўка членаў штабу абавязкова.

Яшчэ адзін катаржны прысуд над б. паслямі „Змаганьня"

ВІЛЬНЯ, 27. Манархічнае памешчыцкае «Слова» ў сваім нумары ад 25-га сьнежня паведамляе яшчэ аб адным катаржным прысудзе над б. паслямі «Змаганьня»: Гаўрылікам, Дварчанінам, Крычыкам і Вальнцом.

Як вядома, у студзені бягучага году віленскі акруговы суд прыгаварыў іх да 8 год катаргі кожнага. Пасьля абвяшчэньня прыгавору пасудныя зрабілі бурную дэманстрацыю, крычаючы лёзунгі: «Прэч фашысцкі ўрад! Прэч фашысцкі суд! Няхай жыве сацыяльная рэвалюцыя»!

За дэманстрацыю пракурор завёў па паслоў яшчэ адну судовую справу. Акруговы суд прыгаварыў паслоў за дэманстрацыю на 1 з пал. гады катаргі.

Цяпер справа дэманстрацыі разглядалася паўторна ў віленскім апэляцыйным судзе. Падсудны пасол Крычык, як піша «Слово» заявіў, што ён ніякай ласкі ад фашысцкага суда не чакае, што «іх вызваліць не буржуазны суд, а пралетарская рэвалюцыя».

Орган «кросовых» зуброў са зьвярыпай злосьцю паведамляе, што падсудныя трымаліся ад пачатку да канца з гонарам, бадзёра і «надзвычай вызывающа».

Апэляцыйны суд зацьвердзіў прыгавор першай судовай інстанцыі.

***

Клюб «Змаганьне», як посьбіт рэвалюцыйных традыцый «Грамады», праводзіў далей яе барацьбу з белапольскай акупацыяй, высока трымаючы сьцяг рэвалюцыйна-вызваленчага руху рабоча-сялянскіх мас Заходняй Беларусі. Ад моманту свайго стварэньня (1928 г.) і па дзень разгрому беларускі сялянска-работніцкі пасольскі клюб «Змаганьне» вёў, ня глядзячы на шалёны тэрор, бязупынна самую актыўную барацьбу за вызваленьне працоўных мас З-Б з-пад улады акупантаў. Агенты дэфэнзывы ня раз страляілі ў пасобных паслоў, зьбівалі іх. Так, 1-га мая 1929 г. ў Вільні быў зьбіт да крыві шпікамі Дварчанін. Улетку гэтага-ж году на мітынгу ў Карэлічах (Навагрудчына) паранен стрэлам з рэвальвэру Крычык. Узімку 1930 г. у Гродзні фашысцкая баёўка напала зноў на тав. Крычыка, зьбіваючы яго кіямі. Такога-ж лёсу ня мінуў ні адзін пасол «Змаганьня».

Беларускія нацыянал-фашысты праз увесь час вялі супроць «Змаганьня» самае паглае правакацыйнае цкаваньне, падрыхтоўваючы «грамадзянскую дуэлю» для зачыненьня клюбу. У канцы 1930 г. польскі фашысцкі ўрад пры самай актыўнай дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстаў усіх адценьняў разграміў «Змаганьне», а яго паслоў кінуў за краты. 12-га студзеня бягучага году пасьля пяцідзённага працэсу віленскі акруговы суд прыгаварыў Гаўрыліка, Дварчаніна, Крычыка і Вальнца на 8 год катаргі кожнага. У маі апэляцыйны суд гэты прыгавор зацьвердзіў. Апрача гэтай асобнай справы паслы «Змаганьня» мелі рад іншых судовых спраў адной з якіх зьяўляецца справа на абвінавачаньні ў дэманстрацыі на суд.

Але ніякія прыгаворы ня здолеюць зламаць рэвалюцыйную энэргію рабоча-сялянскіх паслоў «Змаганьня».

Паўстаньне ў Чылі

НЬЮ-ЁРК, 26. Агенцтва «Асошыэйтэд Прэсс» паведамляе з Чылі, што чылійскі ўрад аддаў загад пачаць кампанію рэпрэсій супроць камуністаў ва ўсёй краіне. Паводле слоў агенцтва, гэта выклікана падзеямі ў гарадох Капіяпа і Вілічэра.

У горадзе Капіяпа (у горна-прамысловым раёне на поўначы Чылі, дзе беспрацоўе і голад дасягнулі асабліва вялікіх памераў) 300 узброеных камуністаў захапілі казарму. Пасьля 3-хгадзіннага бою, у рэзультаце якога забіта каля 20 і паранена шмат камуністаў і жандараў, жандарам удалося адцясьніць камуністаў. Паводле вестак агенцтва сярод паўстанцаў знаходзіліся таксама салдаты. Камуністы, узброеныя кулямётамі, рыхтуюцца да новых атак. Апрача таго агенцтва паведамляе, што ў вакольцах гораду Вілічэр, пры спробе разагнаць камуністычны мітынг, адзін забіт і некалькі паранена жандараў.

(ТАСС).

Далейшае паглыбленьне крызісу ў ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК. Новыя даныя, якія прыводзяцца «Джорнэл оф комэрс», паказваюць далейшае зьніжэньне «ўзроўню гаспадарчай дзейнасьці» ў ПАЗШ Гэтыя даныя знаходзяцца ў наступнай таблічы (прадукцыя вугалю і грузазварот паказаны за апошні тыдзень лістапада, а ўсе іншыя лічбы адносяцца да першага тыдню сьнежня 1930 і 1931 гадоў):

Сярэдняя штодзённая прадукцыя бітумінознага вугалю ў 1930 годзе — 1.674 тыс. тон, у 1931 годзе — 1.255 тыс. тон; выраб электраэнэргіі ў 1930 годзе складае 1.747 млн. кілёват-гадзін, у 1931 годзе — 1.671 квт.-гадзін; загрузка сталяліцейных заводаў у 1930 годзе — 37 проц. (прадукцыйная здольнасьці), у 1931 годзе — 27 проц.; грузазварот (лік нагружаных таварных вагонаў) у 1930 годзе — 702 тыс., у 1931 годзе — 508 тыс.; наяўныя запасы пшаніцы ў 1930 г. — 201 млн. бушэляў, у 1931 годзе — 233 млн. бушэляў; новыя капіталаўкладаньні ў 1930 годзе — 80 млн. даляраў, у 1931 годзе — 19 млн. даляраў.

Прыведзеныя лічбы навочна паказваюць паглыбленьне крызісу ў ПАЗШ. У прамысловасьці крызіс асабліва рэзка праяўляецца ў выключна нізкай загрузцы яе вядучай галіны — сталяліцейнай. Аб крызісе сельскай гаспадаркі можна меркаваць па росьце наяўных запасаў пшаніцы, якія не знаходзяць збыту; нарэшце, у фінансавай галіне вельмі паказальна скарачэньне новых капіталаўкладаньняў у 4 разы. Агульнае зьніжэньне «ўзроўню гаспадарчай дзейнасьці» відаць таксама па скарачэньні грузазвароту на 28 проц.

Тэмп росту беспрацоўя ва Францыі павышаецца

ПАРЫЖ, 26. Тэмп росту беспрацоўя ва Францыі павышаецца з кожным тыднем. Паводле афіцыяльнай статыстыкі лік зарэгістраваных (патрабуючых і атрымліваючых дапамогу) беспрацоўных раўняўся на 19 сьнежня 131.074 супроць 116.176 на 12 сьнежня. Такім чынам колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных павялічылася за тыдзень на 15 тыс., г. зн. на 13 проц. Паводле паведамленьня органу мэталапрамысловасьці «Юзін», тры самыя буйныя сталяліцейныя заводы лётарынгскага басэйну (назвы іх часьціць не падае) закрыты з 24 сьнежня па 4 студзеня з прычыны адсутнасьці заказаў. На адным з гэтых заводаў звольнена 1.500 рабочых. Другія заводы падрыхтоўваюць масавыя звальненьні пасьля новага году.

ЗАМЕЖНАЯ І УНУТРАНЯЯ ПАЛІТЫКА САВЕЦКАГА ЎРАДУ

СЭСІЯЙ ЦВК СССР УХВАЛЕНА АДНАДУШНА

Сэсія зацьвердзіла народна-гаспадарчы плян і кантрольныя лічбы на 1932 г.

На парадку чатырох пасяджэньняў абмяркоўвала сэсія даклады т. т. Молатава і Куйбышава аб народна-гаспадарчым пляне 1932 г.

Прадстаўнікі месц дапоўнілі малюнак дасягненьняў СССР за першыя тры гады пяцігодкі.

На аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі бурна разгарнулася сацыялістычнае будаўніцтва акраін Саюзу.

У Савеце нацыянальнасьцей дэлегаты Казакстану расказвалі аб тым, як іх рэспубліка выканала прамысловую пяцігодку і, складаючы новы, пашыраны плян, таксама з поспехам рэалізуе яго.

Дэлегаты Узбэкістану спыніліся на перамогах у галіне сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва. Ужо трэцяя частка ўсіх пасеўных плошчаў Узбэкістану абабляецца трактарамі. На долю калгасаў прыпадае 70 проц. пасеваў бавоўны. За два гады колькасьць пісьменных узрасла з 18 да 23 проц.

У Саюзным савеце ленінградцы, украінцы, балкане, сібіракі, уральцы і прадстаўнікі іншых раёнаў цалкам ухвалілі плян, унесены на абмеркаваньне сэсіі СНК СССР. Яны абяцалі ня толькі выканаць гэты плян, але і крыніць меры да яго перавыкананьня.

Старшыня ЦК саюзу чорнай мэталургіі тав. Окаркаў ад імя рабочых-мэталургаў высунуў сустрэчны пачуцьцё, які перавышае ўрадавае заданьне на 1 млн. тон.

Перакапаўча прагучэў на сэсіі голас ваенных дэлегатаў. Яны абяцалі, што Чырвоная армія і надалей будзе цьвёрда стаяць на варце межаў Савецкага Саюзу.

Большасьць выступаўшых таварышоў адзначыла неабходнасьць узмоцненай увагі да вытворча-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Шмат гаварылася аб камунальным і жыллёвым будаўніцтве. Гэта будаўніцтва зьяўляецца зараз вузкім месцам. Трэба зрабіць на яго рашучы ўпор.

25-га ў канцы ранішняга пасяджэньня з заключным словам выступіў тав. Молатаў, пасьля чаго сэсія прыняла рэзалюцыю аб народна-гаспадарчым пляне.

Сэсія цалкам ухваліла ўнутраную і замежную палітыку савецкага ўраду. Сэсія зацьвердзіла народна-гаспадарчы плян і кантрольныя лічбы на 1932 г., прадстаўленыя ўрадам.

***

25-га ўвечары па сэсіі выступіў народны камісар фінансаў СССР тав. Грынько. Ён зрабіў даклад аб адзіным фінансавым пляне і дзяржаўным бюджэце СССР на 1932 г.

ПАСТАНОВА ЦВК СССР

2-я сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР, заслухаўшы і абмеркаваўшы даклады старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР тав. **В. М. Молатава (Скрабіна)** і старшыні Дзяржаўнай Плянавай Камісіі Саюзу ССР тав. **В. В. Куйбышава** аб народна-гаспадарчым пляне (кантрольныя лічбы) Саюзу ССР на 1932 г. **пастанаўляе:**

1. Ухваліць замежную і ўнутраную палітыку ўраду Саюзу ССР.
2. Зацьвердзіць прадстаўлены Саветам Народных Камісараў Саюзу ССР народна-гаспадарчы плян Саюзу ССР (кантрольныя лічбы) на 1932 год.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
Г. ПЯТРОЎСКІ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР
25-га сьнежня 1931 г. **А. ЕНУКІДЗЭ.**

Сэсія ЦВК СССР заканчвае работы 28 сьнежня

МАСКВА. 26 сьнежня па Саюзным Савеце і ў Савеце Нацыянальнасьцей сэсіі ЦВК закончыліся спрэчкі па дакладу тав. Грынько. Пасьля заключнага слова Грынько сэсія на абъяднаным пасяджэньні Саюзнага Савету і Савету Нацыянальнасьцей зацьвердзіла прадстаўлены СНК адзіны фінплян і адзіны дзяржбюджэт СССР на 1932 год.

27 сьнежня на ранішнім пасяджэньні быў заслуханы даклад ураду Туркменскай ССР і пачаліся спрэчкі па дакладу. Вячэрняга пасяджэньня 27 сьнежня ня было.

28 сьнежня на ранішнім пасяджэньні будуць закончаны спрэчкі па дакладу ўраду Туркменскай ССР і будзе заслухана заключнае слова па гэтым дакладу. Сэсія заканчвае работы 28 сьнежня.

Абнавіць кіраўніцтва Крычаўскага цэмэнтнага заводу,

якое не забясьпечвае своечасовага пуску важнейшага прадпрыемства

Яшчэ 5-га сьнежня была апублікавана пастанова камісіі выканаўчага пры СНК БССР аб ходзе будаўніцтва Крычаўскага цэмэнтнага заводу. Камісія прызнала ход будаўнічых работ яўна нездавальняючым. Кіраўніцтва набудовы не прыняло ніякіх мер да рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна. Устаноўленыя тэрміны пуску парушаны, будаўніцтва вельмі зацягнулася. Сабекошт работ, у параўнаньні з 1930 г. павысіўся на 13 проц. Сацыялістычнае будаўніцтвам ахоплена толькі 20 проц. рабочых. Прагулы за 1931 г. складалі звыш 15.000 працадзён. Нічога ня зроблена для паляпшэньня культурна-бытавых умоў рабочых.

Пры наяўнасьці навольных тэмпаў будаўнічых работ, невыкананьня асноўных умоў, якія забясьпечваюць своечасовы пуск заводу, кіраўніцтва набудовы цэмэнтнага заводу ашукала пралетарскую грамадзянасьць, выступіўшы з урачыстым рапартам аб скончаньні ў асноўным будаўнічых работ да XIV-й гадавіны Кастрычніка.

Камісія выканаўчая, перадаўшы справу аб ашуканстве ў кантрольныя органы, прапанавала заводжім арганізацыям забясьпечыць пуск прадпрыемства не пазьней 1-га мая, рэалізаваць на справе ўказаньні т. Сталіна.

Атрыманыя намі даныя аб становішчы на набудове сьпіхаюць аб пагрозе зрыву пуску заводу ў вызначаны тэрмін, аб ігнараваньні дырэктыў камісіі выканаўчая.

Дырэктар заводу Шалкоў заяўляе ўсім і кожнаму, што пуск заводу, магчыма, будзе перанесен з мая на сьнежань 1932 г. і што будаўніцтва ў сувязі з гэтым пазіцыя быць або закансервавана, або перадана непасрэдна пад загад ВСНГБ.

Гэтыя апартуністычныя разважаньні ня ператвараюцца ў жыцьцё. Кіраўніцтва заводу зацягвае пуск і проста зрывае ход мантажу; яно зусім не займаецца пытаньнем разгортваньня ўдарніцтва на набудове.

Дырэктар Шалкоў зусім не клапаціцца аб набыцьці матар'ялаў, абсталяваньня, аб своечасовым фінансаваньні набудовы. Мала таго, ён ня раз заяўляў работнікам мантажнай канторы: «Жыдзе згортваецца і ўяжджаць, вы нам тут непатрэбны».

На набудове стварылася такая абстаноўка, якая не дае магчымасьці нармальна працягваць мантажныя работы. Дырэкцыя заводу не аплачвае процантаў, якія належаць мантажнай канторы, у зьвязку з чым запазваецца выплата зарплаты рабочым. Дырэкцыя не зварачае грошай, затрачаных мантажнай канторай на набыцьцё матар'ялаў, якія пры пераходзе мантажу электра-станцыі да заводакіраўніцтва былі перададзены апошняму.

Цяперашнае апартуністычнае кіраўніцтва набудовы цэмэнтнага заводу ў асобе Шалкова не забясьпечвае своечасовага скарачэньня будаўніцтва важнейшага аб'екту. Толькі пры ўмове рашучага ўдару па апартуністах, якія зрываюць бесьперабойны ход будаўнічых работ, мы дасягнем пуску заводу да 1-га мая.

Трэба абнавіць кіраўніцтва цэмэнтнага заводу!

С.

Жудаснае становішча пралетарскіх дзяцей

БЭРЛІН. Зьбядненьне мас у Германіі асабліва ярка праяўляецца ў галечы, якую прыходзіцца перажываць пралетарскім дзецям. Жудасную карціну іх становішча малюе анкета, праведзеная буржуазнай газэтай «Бэрлінэр тагеблят» пад агульнай назвай «Дзеці ў галечы».

Аўтары анкеты — загадчыкі школамі, дзіцячыя дактары педагогі-паразшкольнікі — амаль у ўсіх і тых-жа выразах характарызуюць умовы жыцьця дзяцей у рабочых кварталах.

Убогае рабочае жыльлё, якога нават нельга назваць кватэрай. Няма самых неабходных рэчаў. Шафа, стол, або крэсла аяўляецца недасяжнай раскошай. За кватэру заўсёды ня заплачана, і сям'я жыве пад вечным жахам прымусовага высяленьня.

Надзвычай частыя выпадкі, калі 10-12 чалавек жывуць усе разам у маленечкім пакойчыку. У адной пасьцелі сьпіць некалькі чалавек; пад адной 1 тэй-жа коўдрай ляжаць сухотныя хворыя і «пакуль яшчэ здаровыя» дзеці. У адным з адказаў на анкету расказваецца аб рабочай сям'і, «кватэра» якое такая «цесная, што паўтаравадовае дзіця ўвесь час знаходзіцца ў спарахнелай кальсоны, не пакідаючы яе ні на хвіліну, бо інакш у пакоі не аказалося-б для яго месца».

Як харчуюцца гэтыя дзеці? «Яны ня ведаюць, што такое сапраўдная яда, — гаворыцца ў адным з адказаў, — іх жыцьцё нельга назваць інакш, як маладзеньнем». Натуральна, што ў рабочых кварталах назіраецца надзвычайны попыт на школьныя сьнеданьні для дзяцей. Гэты попыт такі вялікі, што школы кормяць цяпер дзіця толькі за працягу 6 месяцаў, а потым — няхай дзіця абыходзіцца, як ведае... Вельмі характэрна таксама поўнае расгараджэньне, згодна якога дзеці беспрацоўных ня прымаюцца ў дзіцячыя сады пры школах на тэй падставе, што «ў іх бацькоў ёсьць даволі часу, каб даглядаць іх».

Ня гледзячы на зімовы час, рэдка можна спаткаць у рабочых кварталах дзіця ў моцных чаравіках. Часта дзеці зусім ня маюць чаравікаў і верхняй цёплай вопраткі. Наогул іх вопратка складаецца большай часткай «з пары лахмаёў».

Ня дзіва, што пры такіх умовах першыя сур'ёзныя маразы суправаджаліся пагібеллю многіх дзяцей. Бэрлінскі друк падае цэлы рад выпадкаў, калі маленькія дзеці ў часе адсутнасьці бацькоў замярзалі ў хібарках на акраінах гораду, бо гэтыя хібаркі не апяплялісь, з прычыны таго, што грошай ня было купіць апалу.

Калі шматбуржуазны друк вымушан у такіх фарбах маляваць становішча пралетарскіх дзяцей, дык ня цяжка сабе ўявіць, якое гэта становішча ў сапраўднасьці («Известия»).

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Пач.: 6; 7-30, 9 і 10-30. Мастацкі фільм **Праект інжынэра Стронга** (цаною жыцьця)

„Інтэрнацыячэл" Савецкі фільм выт. саюзкіно **Чалавек за бартом** Каса адкрыта ад 12 г. дня

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") Новы мастацкі фільм **ПА КОНГО** ў 5 ч. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. ран.

„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 Каса—ад 5 гадз. Сёньня вядомы фільм **„Коллежский регистратор"** У гал. ролі вядомы артыст Маоніін.

Кіно „КУЛЬТУРА". З 28 сьнежня
З карціны ў 1 сэанс
1. **ДЭЛЬФІН БЕЛАБОКІ** кіно-нарыс у 4 частках.
2. **ЦІХАЯ СЯМЕЙКА** камэдыя ў 2 частках.
3. **ЦЁМНЫ КАНЁК** камэдыя ў 2 частках.
Пачатак сэансаў у 7, 8-40 і 10-30. Каса—ад 5 гадз.

НА СТУДЗЕНЬ
можна яшчэ выпісаць газэту **„ЗЬВЯЗДА"**.
Менгарбюро саюзкруку прапануе **ПРЫЁМ** падпіскі на газэту «ЗЬВЯЗДА» **ДА 30-га СЬНЕЖНЯ** выключна **па абанэмэнтнай сыстэме** з атрыманьнем газэты ў любым кіёску саюзкруку Менгарбюро.

Гарашчадкаса № 16, паведамляе ўсіх кліентаў, што ў сувязі са складаньнем гадавой справы ўвядчы і налічэньня процантаў на 1931 г. усе ашчадкасы г. Менску **31 сьнежня г. г. будуць закрыты** і апэрацыі ўтварацца на будуць. Гарашчадкаса № 16 будзе закрыта 31 сьнежня 1931 г. і 1 студзеня 1932 г. Менгарашчадкаса № 16.

ДЗЯРЖБАНК даводзіць да ведама насельніцтва, што ім **АДКРЫТ ПРЫЁМ ад полісатрымальнікаў ПОЛІСАУ** амэрыканскага страхавога таварыства „Нью-Ёрк" для атрыманьня па імгрошай у Амэрыцы і выдачы іх уладаром полісаў як грашыма, так таварам в фондаў ТОРГСІНУ. За усімі даведкамі па гэтымі пытаньні належыць зварачацца ў замежны аддзел Дзяржбанку. Прыём полісаў квіткоў страхавых узносаў будзе правадзіцца Дзяржбанкам толькі да 1-га лютага 1932 г. Дзяржбанк Беларускай кантора.

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР адбудзецца 29 сьнежня, у 7 гадз. веч., у памяшканьні ЦК МОПР'у.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Справаздача 2-х вайсковых арганізацый МОПР'у (Менск і Быхаў) аб сваёй дзейнасьці.
2. Даклад Ювацкага сэктару Мен. ГК МОПР'у аб рабоце сярод ЮПМ.
3. Справаздача рэдкалегіі газэты „МОПР".
4. Аб перавыбарчай кампаніі нізавых органаў МОПР'у.
5. Рознае.
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК і прэзыдыуму—абавязкова.
Запрашаецца гарадзкі актыў.
Сакратар ЦК МОПР'у БССР Цудзін.

Менскі Вячэрні РАБОЧЫ ТЭХНІКУМ — абвяшчае, — што ўсе прынятыя ў 1931 г. на першы курс абодвух аддзяленьняў Тэхнікуму, паміны прайсьці **перарэгістрацыю,** якая адбудзецца 31 сьнежня 1931 г. і 1 і 2 студзеня 1932 г. з 10 гадзін да 12 г. дня і з 5 да 8 гадзін вечара, у пакоі № 15, помяшканьне Архітэктурна Будаўнічага Тэхнікуму (вул. Карла Маркса, 37).
Заняткі на першым курсе абодвух аддзяленьняў Тэхнікуму пачнуцца 3-га студзеня 1932 г. у 6 гадзін 30 хвілін вечара ў памяшканьні вучэбнага корпусу Арх. Буд. Тэхнікуму (другі паверх), які знаходзіцца па Барысаўскім шляху дом № 55-а (Камароўка).
Навучальная частка Тэхнікуму.

ПЫТАНЬНІ ПОЛУ ПАЯВОГА ВЫХАВАНЬНЯ СШЛЮЗУ І СЯМ'І Альбом у трох частках (больш 1.300 малюнкаў) Пад рэдакцыяй праф. В. І. Талеева, И. Н. Іорданскага, С. Я. Вальфсона і пры ўдзеле праф. Т. П. Сахарова і праф. Н. Сарохціна. Да альбому дадаецца сем кніг (116 стар. тэксту) Цана альбому ў папцы з усімі дадаткамі 30 р. Высылаецца толькі па атрыманьні залатку ня менш 10 руб. Масква, Г. С. П. 19, Мохавая вул., д. № 25, к. маг. асвет. о-ва „ПРОСВЕТ" Увага: Свае адрасы пішыце на купонах перададу дакладна і ясна.

Менскай Цэнтральнай Кнігадацыі „СЛЮЗДРУКУ" **ПАТРЭБНЫ** 2 БУХГАЛТАРЫ І 2 ПАМБУХГАЛТАРЫ. Аплата па згодзе. Зьвярнуцца ў Газбюро, Ленінская 34.

АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ Беларддзяржвыдавецтва „Кнігацэнтра ОГИЗ-а" **перамясьціўся** ў нова-адрамантаванае помяшканьне на рагу Савецкай і Валодарскай, д. № 41, пры магазыне „ЛЕНІНСКАЯ КНІГА", тэл. № 15-66.

Праўленьне МЦРК даводзіць да ведама **ўсіх ударнікаў,** якія забясьпечваюцца на галіне МЦРК, што 25, 26 і 27 сьнежня г. г. будзе праводзіцца **выдача абутку па картках ударнікаў** ва ўніверсальным магазыне № 17 (Ленінская вул.). Праўленьне МЦРК.

ДРУКАРНІ ГАЗЭТЫ **„ЗЬВЯЗДА"** ПАТРЭБЕН НА СТАЛУЮ ПРАЦУ **БУХГАЛТАР.** Зварачацца ў кантору друкарні гор. Менск, Савецкая, 63.

АНОНС! 2 сьнежня ў гуказым кіно-тэатры „Чырвоная Зорка" адкрываецца пастаноўкай лепшы гукавы фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ** Слухайце і глядзеце лепшы гукавы фільм.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" СЁНЬНЯ і штодзенна САВЕЦКАЯ, 87, тэл. № 9-16. Мастацкі фільм вытворчасьці МЕЖРАБПОМ-ФІЛЬМ **Белы наезьнік** (бог вайны) У ГАЛ. РОЛЯХ: Раіса Осіпава, М. Гажэўніка, А. Сноль даў. Пачатак дзённых сэансаў у 2 г. і 3-30. Пачатак вячэрніх сэансаў—6, 7-15, 8-30, 9.45 і 11 гадз. КАСА АДКРЫТА З 12 ГАДЗ. ДНЯ.

Менгарком КП(б)Б 31-га сьнежня г. г. у 7 гадз. вечара. у памяшканьні Гаркому (заля пасяджэньня